ДА НАС ВЯРТАЕЦЦА COVID?

3

ТАЯМНІЦЫ НАШАГА ГНЯЗДЗІЛАВА

12

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

2 ЖНІЎНЯ 2022 г. АЎТОРАК № 149 (29771)

КАРОТКА

- **Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў з прафесійным святам ваеннаслужачых і ветэранаў сіл спецыяльных аперацый Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.**
- Беларускі Чырвоны Крыж запускае дабрачынную кампанію «Збяром дзяцей у школу».
- **Памідорная бітва і кулінарны паядынак: Іўе правядзе свята тамата 13 жніўня.**

ЦЫТАТА ДНЯ

Андрэй ІВАНЕЦ, міністр адукацыі:

«Сёння сістэма атэстацыі абітурыентаў, якія паступаюць ва ўстановы вышэйшай адукацыі, у выглядзе цэнтралізаванага тэсціравання ў першую чаргу накіравана на тое, каб стварыць роўныя, адзіныя ўмовы ацэнкі ведаў усіх абітурыентаў. Мы павінны пакінуць тут усё самае лепшае — гэта адсутнасць карупцыйных рызык. Але, з іншага боку, мы павінны ўбачыць чалавека. Што ў гэтым напрамку будзе зроблена ўжо налета пры ўвядзенні цэнтралізаванага экзамену? У першую чаргу мы пераглядаем падыходы з пункту гледжання складніка тэставай і так званай кантрольнай работы ў структуры тэста. Цяпер гэта прыблізна 50 на 50. Мяркуем, што выйдзем на лічбы, калі тэставая частка зойме толькі 20-25 % ад 100 балаў. Астатняе — традыцыйная кантрольная работа, але пры гэтым праверка выніку будзе праводзіцца машынай, камп'ютарам. Гэта значыць, што тут таксама будуць выключаны карупцыйныя рызыкі».

ISSN 1990 — 763X

На хлебнай вышыні

Фота Віктара ДРАЧОВА.

На полі, якое належыць ААТ «Тураўшчына», каля вёскі Рычча Жыткавіцкага раёна жнуць авёс. Камбайнер аддзялення «Знаменка» Іван КУЗЬМІЧ летась быў найлепшым і ў сваёй гаспадарцы, і ў раёне. Сёлета здаваць лідарскія пазіцыі ён не збіраецца. А ўвогуле, у «Тураўшчыне» ўжо жалі чвэрць пасеяных збожжавых.

Эксклюзіў

Андрэй РЖАВУСКІ:

«ІНДЫЯ — АКНО БЯЗМЕЖНЫХ МАГЧЫМАСЦЯЎ ДЛЯ БЕЛАРУСІ»

Супрацоўніцтва з Індыяй з'яўляецца адным з ключавых прыярытэтаў нашай краіны ў Азіі. Але не толькі. «Як гісторык я абсалютна перакананы ў тым (і гэта мы з вамі ўбачым хуткім часам), што ўся планета будзе развівацца, арыентуючыся на тую частку Азіі, у якой размешчана Індыя, — заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падчас сустрэчы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Індыя ў Рэспубліцы Беларусь Алокам Ранджанам Джа. — Вялікі Кітай, вялізная Індыя, якая вельмі перспектыўна і дынамічна развіваецца, — яны будуць дыктаваць моду ў будучыні для ўсяго свету. Мы вітаем такую будучыню планеты і, натуральна, хацелі б знайсці сваё месца ў росце індыйскай эканомікі, хацелі б мець падтрымку індыйскай дзяржавы на ўсіх узроўнях. У даўгу не застанемся».

СТАР. 4

Нерухомасць і грошы

КОЛЬКАСЦЬ ПАКУПНІКОЎ РАСЦЕ, АЛЕ ЦЭНЫ ПРАЦЯГВАЮЦЬ ЗНІЖАЦЦА

Гэтае лета мёртвым для рынку жылой нерухомасці нашай краіны не назавеш. А напярэдзе яшчэ хвалепадобная актывізацыя асобных кліентаў (бацькі новых, прыезджых студэнтаў), — яна стартуе дзесьці з 15 жніўня.

Па словах дырэктара агенцтва нерухомасці «БелЦГН» і ганаровага старшыні Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» Мікалая ПРАСТАЛУПАВА, продаж кватэр у ліпені развіваецца без якіх-небудзь скачкоў, досыць роўнымі тэмпамі. Пакуль. Бо калі прааналізаваць статыстыку за чэрвень, атрымліваецца досыць актыўны пачатак лета.

СТАР. 7

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«УСЁ ПАВІННА БЫЦЬ НА КАРЫСЦЬ ДЗЯРЖАВЫ, КАНСТРУКТЫЎНА»

У Палацы Незалежнасці ў панядзелак адбыўся кадравы дзень. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прызначыў Дзмітрыя Крутога на пасаду Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі і па сумяшчальніцтве Паўнамоцнага прадстаўніка Рэспублікі Беларусь пры Эканамічным савеце СНД. Таксама Дзмітрый Крутой стане спецыяльным прадстаўніком Рэспублікі Беларусь па пытаннях інтэграцыйнага супрацоўніцтва ў рамках Саюзнай дзяржавы, Еўразійскага эканамічнага саюза, Садружнасці Незалежных Дзяржаў, Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы.

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што няма ніякай неабходнасці выказваць нейкія пажаданні Дзмітрыю Крутому. «Вы добра ведаеце, што гэта за пасольства. Працуючы ў Адміністрацыі Прэзідэнта, усе ідэі Прэзідэнта адносна Расіі (я спадзяюся, так і ёсць) увабралі ў сябе. Вы ведаеце, што гэта наш асноўны напрамак у эканамічным плане. А што да палітыкі, то тут і размоў няма. Гэта родная, дружалюбная нам дзяржава, і вы павінны на такой жа ідэалогіі прадстаўляць нашу краіну ў Расійскай Федэрацыі. Вы захоўваеце паўнамоцтвы віцэ-прэм'ера, як і было пры Уладзіміру Ільічу Сямашку. Што там трэба рабіць, вы таксама добра ведаеце», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Па яго словах, галоўнае пытанне — эканоміка. Будзе эканоміка — будзе ўсё астатняе. Прэзідэнт адзначыў, што часта з Захаду з'яўляюцца размовы аб тым, што Беларусь губляе незалежнасць і суверэнітэт, супрацоўнічаючы з Расіяй. «Хачу шчыра вам сказаць як будучаму прадстаўніку нашай краіны ў Расіі: суверэнітэт і незалежнасць нашай дзяржавы — рэчы пастаянныя, гэта нават не абмяркоўваецца. Я яшчэ хачу паўтарыць, што мы дастаткова разумныя людзі і Прэзідэнт Расіі абсалютна свядома разумее, у якім напрамку мы павінны рухацца. І, захоўваючы незалежнасць Беларусі і Расіі, мы зможам выбудаваць такі саюз, якому могуць пазайздросціць і федэратыўныя, і канфедэратыўныя, і нават унітарныя дзяржавы. Усё астатняе вы ведаеце, што там рабіць. Будзьце ўвесь час на сувязі. Вы, можа, і не хацелі б быць увесь час на сувязі, але з прычыны абставін і той палітыкі, якая праводзіцца паміж дзвюма дзяржавамі, вы ўвесь час будзеце ў цэнтры ўвагі», — сказаў беларускі лідар. Паводле яго слоў, Пасольства ў Расіі — гэта другі ўрад, з пункту гледжання эканомікі гэта абсалютна дакладна. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што расказаў Уладзіміру Пуціну аб тым, што Дзмітрый Крутой — чалавек перспектыўны. Ён таксама звярнуў увагу: ад дзеянняў новага пасла шмат у чым залежыць сітуацыя ў Беларусі.

«Паглядзіце на пасольства, трэба выбудаваць сістэму, хоць не думаю, што ў Сямашкі нехта забалуе. Як бы мы да яго ні ставіліся, з яго крутым характарам і іншае, гэта чалавек сістэмны, дасведчаны. Думаю, там з пасольствам усё ў парадку. Але сітуацыю ў самім апараце пасольства трэба выбудоўваць такім чынам, у сувязі з тым, якія задачы там трэба вырашаць. Гэта вы таксама ведаеце», — канстатаваў Прэзідэнт.

Фінансавая сфера — гэта вельмі важна

Максім Ермаловіч, які быў паслом у Вялікабрытаніі, прызначаны на пасаду намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта. «Ён добра ведае работу ва ўрадзе, у Адміністрацыі Прэзідэнта. Вопытны, адукаваны, сучасны чалавек. Ну і які панюхаў, што такое Захад. Я гэта добра ведаю. Чалавек нармальны, прафесійны, прабеларускі, перакананы. Ён разумее, што трэба рабіць у Беларусі, убачыўшы адну з перадавых краін свету, і тое, што там дрэнна, і тое, што добра. Натуральна, што шмат добрага з пункту гледжання эканомікі, англійская палітыка нам не патрэбная, мы не збіраемся яе капіраваць. А вось эканоміка, фінансавая сфера — гэта вельмі важна», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Новым міністрам лясной гаспадаркі прызначаны Аляксандр Кулік. «Я разумею, што вы не ва ўсім былі згодны з былым міністрам лясной гаспадаркі. Гэта не значыць, што ўсё было дрэнна ў лесе. Але лес ёсць лес. І кантраляваць сітуацыю, кіраваць ёю трэба. Улічваючы ўсе вашы перыпетыі ў жыцці, я вельмі спадзяюся, што вы не падведзяце... Памылкі ранейшага кіраўніцтва і недапушчальныя ўчынкі, якія здзейсніў міністр, натуральна, не адзін ён там працаваў, усім вядомыя. Я спадзяюся, вы з гэтага зробіце адпаведныя высновы», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Маладое пакаленне — будучыня нашай краіны

Кандыдатура Юрыя Раманоўскага ўзгоднена на пасаду рэктара Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Прэзідэнт падкрэсліў, што былы рэктар Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта Алег Раманаў абраны старшынёй Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь». Па словах Прэзідэнта, гэта фактычна найбуйнейшая партыя. «Гэтае аб'яднанне дзейнічае структурна, законна, не парушаючы законы. Яны не ходзяць і грошы не просяць, яны ўвесь час уносяць прапановы аб пераўтварэнні некаторых грамадскіх аб'яднанняў, у тым ліку і «Белай Русі» ў партыйную арганізацыю. Я ўвесь час не тое што стрымліваю, а папярэджваю, што тут паспешлівасць абсалютна не патрэбна, тут трэба саспець, прыйсці ў спакойным рытме. Яны згаджаюцца са мной, але, мусіць, пасля прыняцця закона аб партыйным будаўніцтве паўстане такое пытанне. Я не буду перашкаджаць. Мы будзем развіваць усе арганізацыі грамадскія, якія займаюць патрыятычную, з пункту гледжання дзяржавы, пазіцыю. Калі ты за суверэнітэт, незалежнасць, за сваю краіну — ты чалавек дзяржаўны, ты беларус сапраўдны. Мы гэтую пазіцыю будзем падтрымліваць. Патрэбны розныя пункты гледжання. Але ўсё павінна быць на карысць дзяржавы, канструктыўна», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён падкрэсліў, што Юрыю Раманоўскаму неабходна працягнуць тыя добрыя справы, якія распачаў былы рэктар. На яго думку, у новага рэктара гэта атрымаецца.

Аляксандр Дараховіч зойме пасаду першага намесніка міністра спорту і турызму. Таццяна Шаўцова пераходзіць на пасаду кіраўніка спраў Мінскага аблвыканкама. А Максім Аляшкевіч — на пасаду члена Мінскага аблвыканкама.

Валерыя СЦЯЦКО.

У тэму

ГАЛОЎНАЕ — ГЭТА ЭКАНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ

Новы Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі Дзмітрый КРУТОЙ расказаў журналістам, якія задачы паставіў перад ім Аляксандр Лукашэнка.

«Задачы даволі традыцыйныя. Галоўнае, што сказаў Прэзідэнт, — гэта эканоміка, эканамічнае развіццё. У палітычных адносінах мы ўжо, па сутнасці, ад стратэгічнага партнёрства перайшлі да паўнацэннага саюза. Застаецца напоўніць гэты палітычны складнік канкрэтным эканамічным зместам, і гэта ў першую чаргу тавараабарот», — расказаў пасол. Ён звярнуў увагу, што Беларусь і Расія рэалізоўваюць 28 саюзных праграм. «980 разнастайных мерапрыемстваў — гэта напаўненне 28 праграм. Сістэма маніторынгу паказвае, што на сёння выканана 35 працэнтаў. Такая дынаміка прэзідэнтаў Беларусі і Расіі не вельмі задавальняе», — адзначыў ён. Паколькі да 1 студзеня 2024 года павінна быць паўнацэнная адзіная эканамічная прастора Беларусі і Расіі ў рамках Саюзнай дзяржавы, то тэмпы выканання праграм павінны быць больш высокія. Дзмітрый Крутой растлумачыў, у якіх напрамках прыйдзецца працаваць больш інтэнсіўна.

Першае — адзіная прамыслова-аграрная палітыка. Другое — уніфікаванае рэгуляванне транспартнага рынку. Па словах пасла, павінна быць створана цалкам безбар'ернае асяроддзе ў транспартным комплексе нашых краін. Трэці напрамак — аб'яднаныя энергетычныя рынкі. «Для нашых краін гэта вельмі важная тэма, тут ёсць вельмі сур'ёзныя зрухі, у тым ліку і пераход на разлікі ў нацыянальных валютах і за нафту, і за газ. І далей — тэма плацежнай сістэмы. Прэзідэнт адзначыў, што ва ўмовах санкцый ёсць праблемы праходжання плацяжоў. Яны зараз, вядома, вырашаюцца. Але найхутчэйшы пераход на разлікі ў нацыянальных валютах і ў частцы фарміравання цэн, і ў частцы праходжання плацяжоў — гэта пытанне, якое я буду курыраваць, знаходзячыся ў Маскве», — расказаў Дзмітрый Крутой. Ён таксама звярнуў увагу на транспартныя праекты — марскія парты, магчымыя асобныя тэрміналы для беларускіх грузаў, высакахуткасныя чыгункі. Пасол падкрэсліў, што трэба разабрацца з тымі буйнымі праектамі, якія цяпер стаяць на паўзе, і вырашыць, што трэба зрабіць, каб яны рухаліся.

Ёсць вялікія перспектывы на будаўнічым рынку.

Дзмітрый Крутой падкрэсліў важнасць таго, што нядаўна адзначаны 30-гадовы юбілей беларуска-расійскіх дыпламатычных адносін. Паводле яго слоў, юбілей выпаў на такі складаны, але цікавы час.

Блізкая ўлада

Выслухаць і дапамагчы

Старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван КРУПКО правёў трохгадзінную прамую тэлефонную лінію. Звароты грамадзян аператы ўна адрасаваліся прадстаўнікам усіх адказных службаў.

Адразу на некалькіх праблемных пытаннях засяродзіла ўвагу жыхарка гарадскога пасёлка Камарын Брагінскага раёна. Кацярына Міхайлаўна паскардзілася на нязручны транспартны графік аўтобусаў і маршрутных таксі. Як патлумачыла жанчына, даехаць з гарпасёлка да Гомеля ці Брагіна ў пэўныя дні проста немагчыма.

— А многія і сярод тыдня ездзяць. Да таго ж білеты можна набыць толькі па інтэрнэце. Пажылыя прыходзяць да аўтобуса, а білетаў няма, — агучыла заяўніца сітуацыю, якая хвалюе многіх жыхароў Камарына.

Жанчына распавяла таксама, што ў яе выклікае пытанні арганізацыя навучальнага працэсу і харчавання дзяцей у мясцовай школе. Прасіла растлумачыць, якім чынам ідзе налічэнне па камунальных паслугах за водакарыстанне і вываз адходаў. На ўсе агучаныя звароты жыхарка Камарына атрымае падрабязныя пісьмовыя адказы. Яе заўвагі ўзяты на рэагаванне адказнымі службамі. Сам жа кіраўнік рэгіёна падзякаваў жанчыне за неабыякавую пазіцыю.

Па дапамогу звярнулася таксама Алена Мікалаеўна з Рэчыцы. Шматдзетнай маці, каб расказаць аб сваёй складаной жыццёвай сітуацыі, прыйшлося сабрацца з сіламі — эмоцыі перапаўнялі. Амаль год таму жанчына стала ўдавой. Засталася адна з трыма дзецьмі: выхоўвае старэйшых двайнят і малодшую дачку. Дзяўчынка па стане здароўя пераведзена на хатняе навучанне.

Як распавяла Алена Мікалаеўна, пакуль быў жывы муж, яна не працавала, каб належным чынам даглядаць дзяцей і асабліва дачку. Цяпер жа гатова выйсці на працу, але дзяўчынку нельга пакідаць адну без нагляду. Уладкаваць яе ў спецыялізаваную ўстанову таксама няма магчымасці, бо пры мностве захворванняў для гэтага няма паказанняў.

Дазвол хадзіць у звычайную школу яе дачцэ таксама не выдалі. Алена Мікалаеўна распавяла, што ўжо звярталася ва ўпраўленне аховы здароўя, але адказ, які атрымала, палічыла не канкрэтным, таму вырашыла шукаць дапамогі на «гарачай лініі» губернатара.

— Клубок праблем усё больш заблытваецца, і я не магу яго разблытаць, — ледзь не плачучы тлумачыла шматдзетная маці.

Для гэтага будзе створана камісія з прадстаўнікоў сферы аховы здароўя, адукацыі, сацыяльнай абароны, запэўніў жанчыну Іван Крупко.

— Нас не можа не хваляваць лёс гэтай сям'і, — звярнуўся губернатар да спецыялістаў адказных ведамстваў. — Сітуацыя няпростая. Неабходна выехаць і разабрацца, высветліць, чым можна дапамагчы. Калі трэба, падабраць варыянт працаўладкавання...

Падчас прамой тэлефоннай лініі старшыні аблвыканкама жыхары Гомельшчыны таксама агучылі зямельныя пытанні, спрэчныя моманты па налічэнні зарплаты і працаўладкаванні, праблемы жыллёва-камунальнай сферы.

Кожны зварот узяты кіраўніком рэгіёна на кантроль.

Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота БелТА.

«ГЭТА НАША ШЧАСЦЕ, ШТО МЫ ВЫБУДАВАЛІ ДОБРЫЯ АДНОСІНЫ З КІТАЙСКАЙ НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКАЙ»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў рабочую сустрэчу з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Беларусі ў Кітаі Юрыем Сянько. Гэтую пасаду ён займае з 2020 года. «Вы прапрацавалі дастаткова, і вы бачыце нейкія дадатковыя нашы магчымасці ў Кітайскай Народнай Рэспубліцы», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Па словах кіраўніка дзяржавы, асаблівую ўвагу варта звярнуць на гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва і крэдытна-фінансавы складнік. «Трэба паглядзець, дзе нам яшчэ паднапружыцца і папрацаваць сур'ёзна для таго, каб асабліва ў гэты момант не страціць тэмпы. Таму што дынаміка была добрая — і гандлю, і інвестыцыйная. Натуральна, ва ўмовах санкцый і Кітай можа асцерагацца, баяцца нейкіх крокаў: людзі вельмі акуратныя, асцярожныя. Тым не менш гэта наша шчасце, што мы выбудавалі добрыя адносіны з Кітайскай Народнай Рэспублікай», — заявіў ён.

Юрый Сянько адзначыў, што Беларусь і Кітай дэманструюць поўнае разуменне, супрацоўнічаючы на ўсіх міжнародных пляцоўках. «У галіне эканамічных адносін я прыходжу да высновы і відаць па настроях нашых беларускіх прадпрыемстваў: у нас ўнікальныя магчымасці для таго, каб нарасціць тэмпы работы з Кітаем. Гэта, уласна, і робіцца апошнія сем гадоў з моманту абвяшчэння Кітаем ініцыятывы «Пояс і шлях». Гэта быў сур'ёзны штуршок, калі Беларусь далучылася да гэтай ініцыятывы і актыўна пачала працаваць з Кітаем», — заявіў ён.

Яшчэ адным праектам, які даў імпульс для развіцця супрацоўніцтва паміж краінамі, стаў індустрыяльны парк «Вялікі камень». Істотны ўплыў аказалі і дамоўленасці лідараў Беларусі і Кітая аб правядзенні Года рэгіёнаў, а таксама дырэктыва Прэзідэнта аб развіцці двухбаковых адносін з КНР. «Для Кітая гэта вельмі важны сігнал па тым пытанні, як Беларусь ставіцца да Кітая і якія нашы стратэгічныя намеры», — звярнуў увагу Юрый Сянько.

Валерыя СЦЯЦКО.

Адукацыя

НАЙВАЖНЕЙШАЕ ПЫТАННЕ — КАДРАВАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ГАЛІНЫ

Пытанні падрыхтоўкі да 2022/2023 навучальнага года абмеркавалі на калегіі ў Міністэрстве адукацыі.

«Гатоўнасць устаноў адукацыі да новага навучальнага года — не толькі правядзенне бягучага рамонту, абнаўленне матэрыяльна-тэхнічнай і навучальнай базы, хоць і гэта немалаважна. Мы павінны казаць аб аб'ёмах фінансавання на падрыхтоўку да навучальнага года. Найважнейшае пытанне, якое ўсіх датычыцца, — кадравае забеспячэнне галіны. Сёння створаны ўсе ўмовы для таго, каб мы прыцягвалі матываваных зацікаўленых маладых людзей у прафесію педагога, — падкрэсліў у сваім выступленні **міністр адукацыі Андрэй ІВАНЕЦ.** — Яшчэ адно важнае пытанне — удасканаленне выхаваўчай работы ва ўстановах адукацыі. Ва ўсе аблвыканкамы ўжо накіраваны крытэрыі эфектыўнасці рэалізацыі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі. Вызначаны адпаведныя дамены, індэксы, субіндэксы, якія ахопліваюць фактычна ўсе сферы: і сямейную палітыку, і здароўе, і патрыятычнае выхаванне, і ўдзел у грамадска-палітычным жыцці, і інфармацыйнае поле. Менавіта па гэтых крытэрыях будзе ацэньвацца дзейнасць усіх суб'ектаў рэалізацыі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі».

Члены калегіі абмеркавалі таксама пытанні ваенна-патрыятычнага выхавання моладзі, заканчэння прыёмнай кампаніі на бюджэтныя месцы ў ВНУ, пытанні мэтавай падрыхтоўкі спецыялістаў і шмат іншага. «Налета мы павінны выйсці на наступныя лічбы мэтавай падрыхтоўкі — да 60 працэнтаў па ўсіх спецыяльнасцях», — праінфармаваў прысутных міністр.

У новым навучальным годзе ў краіне будуць функцыянаваць 2866 устаноў дашкольнай адукацыі на 436,3 тысячы месцаў, 2901 дзяржаўная ўстанова адукацыі, якая рэалізоўвае адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, 237 устаноў спецыяльнай адукацыі, 1682 спецыяльныя групы і 1979 груп інтэграванага навучання і выхавання ва ўстановах дашкольнай адукацыі, 170 спецыяльных класаў і 5295 класаў інтэграванага навучання і выхавання ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі, 3601 пункт карэкцыйна-педагагічнай дапамогі. Ахоп спецыяльнай адукацыяй і карэкцыйна-педагагічнай дапамогай складае 99,9 працэнта.

Плануецца, што 1 верасня колькасць выхаванцаў ва ўстановах дашкольнай адукацыі складзе каля 390,9 тысячы чалавек, вучэбныя заняткі пачне каля 1 мільёна 85 тысяч навучэнцаў, у тым ліку 115 тысяч першакласнікаў.

У 2022 годзе плануецца будаўніцтва 13 устаноў дашкольнай адукацыі на 2275 месцаў. З іх па стане на 20 ліпеня ўведзена ў эксплуатацыю дзве ўстановы на 280 месцаў.

Таксама запланаваны ўвод чатырох устаноў агульнай сярэдняй адукацыі агульнай магутнасцю 2682 месцы.

Да новага навучальнага года будуць выдадзены 44 навучальныя дапаможнікі для ўстаноў адукацыі, якія рэалізоўваюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі.

Завяршыўся пераход школы на новыя навучальныя праграмы. Унясенне змяненняў у іх ажыццяўляецца з улікам практыкі іх прымянення.

У дапамогу органам кіравання адукацыяй, адміністрацыі ўстаноў адукацыі і настаўнікам-прадметнікам Міністэрствам адукацыі падрыхтаваны інструктыўна-метадычныя пісьмы аб асаблівасцях арганізацыі адукацыйнага працэсу, якія размешчаны на сайце Міністэрства адукацыі і на Нацыянальным адукацыйным партале.

На калегіі абмяркоўвалася таксама падрыхтоўка да новага навучальнага года ўстаноў вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай, прафесійна-тэхнічнай і дадатковай адукацыі дзяцей і дарослых.

У новым навучальным годзе ў краіне будуць функцыянаваць 42 дзяржаўныя ўстановы вышэйшай адукацыі, а таксама восем устаноў вышэйшай адукацыі прыватнай формы ўласнасці. На ўзроўні прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі — 122 установы і 110 устаноў — на ўзроўні сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

На сённяшні дзень ва ўстановах прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі створаны 52 рэсурсныя цэнтры. На іх базе ў адукацыйны працэс укараняюцца сучасныя адукацыйныя тэхналогіі, прымяняюцца найноўшыя сродкі навучання і абсталяванне.

У рамках работы па ўдасканаленні вучэбна-метадычнага забеспячэння дадатковай адукацыі дарослых і абнаўленні зместу адукацыйных праграм з пачатку 2022 года перагледжана і зацверджана 27 адукацыйных стандартаў перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў і 18 тыпавых вучэбных планаў па спецыяльнасцях перападрыхтоўкі.

Адна з задач развіцця ўсёй сістэмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі — аператыўнае кіраванне працэсам аптымізацыі за кошт магчымага аб'яднання рэсурсаў аднапрофільных і шматпрофільных устаноў. На сённяшні дзень у Беларусі дзейнічаюць 264 установы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.

Спецыялісты Міністэрства адукацыі звярнулі ўвагу кіраўнікоў устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі на неабходнасць узважанага падыходу да арганізацыі работы аб'яднанняў па інтарэсах у новым навучальным годзе і вывучэння запатрабаванасці адкрыцця тых ці іншых аб'яднанняў па інтарэсах.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Дзеля памяці

ВЫСТАЎКА, ПРЫСВЕЧАНАЯ ПАРТЫЗАНСКІМ КАМАНДЗІРАМ

Асабістыя рэчы, дакументы, фатаграфіі лідараў партызанскага руху пакажуць на часовай экспазіцыі «Партызанскія кіраўнікі Беларусі» ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Аб гэтым карэспандэнту БелТА паведаміла куратар выставы загадчыца аддзела гісторыі партызанскага руху музея Наталля ЯЦКЕВІЧ.

«Выстава прысвечана 120-годдзю з дня нараджэння кіраўнікоў беларускага партызанскага руху ў гады вайны Панцеляймона Панамарэнкі, Пятра Калініна, Ільі Кожара, Емяльяна Барыкіна і 110-годдзю з дня нараджэння таксама аднаго з лідараў партызанскага руху Барыса Булата. Будуць прадстаўлены фатаграфіі і дакументы аб дзейнасці кіраўнікоў партызанскага руху ваеннага і пасляваеннага перыядаў, прадметы выяўленчага мастацтва беларускіх мастакоў, плакаты, граматы і асабістыя рэчы юбіляраў, якім прысвечана выстава», — расказала Наталля Яцкевіч.

Экспазіцыя «Партызанскія кіраўнікі Беларусі» ўключае пяць раздзелаў, якія дэманструюць даваеннае жыццё, дзейнасць у час Вялікай Айчыннай вайны, удзел у аднаўленні народнай гаспадаркі краіны кожнага з лідараў партызанскага руху. «Гэтыя кіраўнікі ўнеслі значны ўклад у развіццё народнай барацьбы ў тыле ворага супраць фашысцкіх захопнікаў. Ад умелага і правільнага кіраўніцтва Панамарэнкі, Калініна, Кожара, Барыкіна і Булата залежала рэзультатыўнасць і эфектыўнасць баявой дзейнасці беларускіх партызан», — падкрэсліла куратар выставы.

Пасля вайны гэтыя лідары знаходзіліся на адказных пасадах дзяржаўнага кіравання. «На іх плечы лягла цяжкая задача па арганізацыі аднаўлення разбуранай вайной народнай гаспадаркі Беларусі, вяртанні грамадзян да мірнага жыцця і стварэння эканамічнага падмурка для ператварэння Беларусі ў самую перадавую і высокаразвітую рэспубліку СССР», — дадала Наталля Яцкевіч.

Часовая экспазіцыя «Партызанскія кіраўнікі Беларусі» адкрыецца 5 жніўня ў мастацкай галерэі музея ВАВ. Работа выставы прадоўжыцца да 5 верасня.

Будзьце здаровыя!

ПРАЗ МЕСЯЦ ЧАКАЕЦЦА НОВАЯ ХВАЛЯ COVID-19

Каму і якой вакцынай варта прышчапляцца?

Сусветная арганізацыя аховы здароўя прагназуе новую хвалю COVID-19 восенню-зімой бягучага года. Беларускія медыкі згодныя з гэтым і чакаюць уздыму захваральнасці ўжо ў канцы жніўня — пачатку верасня. Як падрыхтавацца да яго? Каму варта рабіць бустарную прышчэпку? Ці варта перад гэтым вымяраць узровень антыцелаў? Якімі вакцынамі робяцца такія прышчэпкі? Пра гэта і іншае гутарым з урачом-эпідэміёлагам, загадчыкам аддзялення імунапрафілактыкі аддзела эпідэміялогіі Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Марынай КАЧКАН.

— Марына Віктараўна, растлумачце, што такое бустарная прышчэпка? Якой вакцынай яна можа выконвацца? Ці можна прышчапіцца кітайскай вакцынай?

— Бустарная прышчэпка — гэта дадатковае (паўторнае) увядзенне вакцыны праз нейкі пэўны час пасля атрымання асноўнага або папярэдняга дадатковага курса вакцынацыі. Гэта робіцца для заахвочвання імуннай сістэмы і прымушае яе зноў выпрацоўваць антыцелы да інфекцыйнага агента.

У дачыненні да каранавіруснай інфекцыі бустарная вакцынацыя праводзіцца праз 6 і больш месяцаў пасля скончанай першаснай вакцынацыі і (або) раней праведзенай бустарнай вакцынацыі. У адпаведнасці з нарматыўнымі дакументамі Міністэрства аховы здароўя бустарная прышчэпка можа быць выканана вакцынамі «Гам-КОВІД-Вак» або «Спадарожнік Лайт» у залежнасці ад таго, якая вакцына была ўведзена папярэдні раз. У перыяд цяжарнасці і груднога кармлення бустарная прышчэпка праводзіцца вакцынай SINOPHARM вытворчасці КНР.

Наяўнасць вакцын неабходна ўдакладняць у арганізацыі аховы здароўя, у якой вы плануеце прышчапляцца.

— Каму паказана бустарная вакцынацыя? Праз які перыяд пасля асноўнага курса яе варта рабіць і ці трэба яе паўтараць кожныя паўгода?

— Бустарная вакцынацыя праводзіцца асобам з 18 гадоў і старэйшым праз шэсць і больш месяцаў пасля асноўнага курса, а затым — кожныя паўгода.

— Калі вакцынаваўся, а потым перахварэў на COVID-19, праз які час пасля выздараўлення рабіць бустарную прышчэпку?

— Вакцынацыя пасля перанесенага захворвання можа быць зроблена праз 2-8 тыдняў пасля выздараўлення. Гэты перыяд вызначаецца цяжарам захворвання: пры адносна лёгкім ходзе прышчэпку можна зрабіць ужо праз два тыдні. А калі захворванне было ў цяжкай форме з ускладненнямі, варта вытрымаць не менш за восем тыдняў.

— А ці трэба правяраць узровень антыцелаў перад бустарнай прышчэпкай?

— Не. Мэтазгоднасць абследавання перад правядзеннем бустарнай вакцынацыі на наяўнасць антыгена або антыцелаў да віруса SARS-CoV-2 адсутнічае, бо не нясе ў сабе ніякай канкрэтнай інфармацыі для прыняцця рашэння аб вакцынацыі.

— Калі антыцелы прысутнічаюць, але ўжо прайшло шэсць месяцаў пасля асноўнага курса, ці трэба прышчапляцца?

— Так. Наяўнасць антыцелаў да COVID-19 не з'яўляецца крытэрыем для ўвядзення вакцыны. Невядома, як доўга антыцелы пратрымаюцца на ахоўным узроўні. Бустарная доза вакцыны не перашкаджае фарміраванню імунітэту, а, наадварот, яшчэ ў большай меры павялічвае эфектыўнасць імуннай аховы арганізма.

— Калі чалавек прайшоў асноўны курс і адну бустарную прышчэпку, і пасля таго прайшло шэсць месяцаў, ці трэба зноў прышчэплівацца і якой вакцынай?

— Так. Вакцына вызначаецца ўчастковым урачом у залежнасці ад таго, якімі вакцынамі чалавек прышчапляўся раней. Напрыклад: калі ён прышчэплены любой вакцынай, а першы бустар быў выкананы вакцынай «Спадарожнік Лайт», то другі бустар робіцца другім кампанентам вакцыны «Гам-КОВІД-Вак». Калі першасная вакцынацыя выканана вакцынай «Спадарожнік Лайт», першы бустар — другім кампанентам вакцыны «Гам-КОВІД-Вак», то другі бустар робіцца першым кампанентам вакцыны «Гам-КОВІД-Вак».

— То-бок першая і другая бустарная прышчэпкі павінны рабіцца рознымі вакцынамі?

— Могуць быць выкананы рознымі вакцынамі або рознымі кампанентамі вакцыны «Гам-КОВІД-Вак».

— Калі пасля кожнай прышчэпкі асноўнага курса былі пабочныя эфекты, напрыклад, падымалася тэмпература, ці будуць яны пасля бустарнай?

— Магчыма, будуць, але не абавязкова. Прадбачыць рэакцыю арганізма немагчыма.

— За які час фарміруюцца антыцелы? За які тэрмін да ўздыму захваральнасці трэба паспець вакцынавацца?

— Для выпрацоўкі ахоўнага цітру антыцелаў арганізму неабходна звычайна два-тры тыдні пасля завяршэння першаснай серыі прышчэпак. Таму неабходна паспець прышчапіцца за месяц да ўздыму захваральнасці, улічваючы той факт, што па заканчэнні вызначанага часу, як правіла, звыш 6-12 месяцаў, напружанасць імунітэту змяншаецца. Таму лепш прытрымлівацца ўстаноўленых Міністэрствам аховы здароўя аптымальных інтэрвалаў вакцынацыі.

Алена КРАВЕЦ.

Андрэй РЖАВУСКІ:

«ІНДЫЯ — АКНО БЯЗМЕЖНЫХ МАГЧЫМАСЦЯЎ ДЛЯ БЕЛАРУСІ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Двухбаковае беларуска-індыйскае ўзаемадзеянне актыўна развіваецца на працягу дзесяцігоддзяў. Дыпламатычныя адносіны паміж нашымі дзяржавамі былі ўстаноўлены 17 красавіка 1992-га. «Нягледзячы на геаграфічную аддаленасць, за апошнія 30 гадоў паміж нашымі дзяржавамі склаліся па-сапраўднаму цёплыя, узаемапаважлівыя, даверлівыя адносіны, — адзначыў Прэзідэнт Беларусі ў віншаванні Драўпадзі Мурму з нагоды яе перамогі на прэзідэнцкіх выбарах у Індыі. — Прыемна адзначыць, што цяпер двухбаковае супрацоўніцтва выходзіць за рамкі звычайных экспартна-імпартных аперацый і мае ўхіл да пабудовы больш глыбокай кааперацыі ў галінах фармацэўтыкі, машынабудавання, сельскай гаспадаркі, прамысловасці, навукі і адукацыі». Аляксандр Лукашэнка пацвердзіў зацікаўленасць у далейшым пашырэнні беларуска-індыйскага дыялогу. Якім чынам развіваецца стратэгічнае ўзаемадзеянне паміж нашымі краінамі, у эксклюзіўным інтэрв'ю «Звяздзе» распавёў **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Індыя, Народнай Рэспубліцы Бангладэш, Федэральнай Дэмакратычнай Рэспубліцы Непал і Дэмакратычнай Сацыялістычнай Рэспубліцы Шры-Ланка Андрэй РЖАВУСКІ.**

— Андрэй Іосіфавіч, чаго ўдалося дасягнуць на працягу трох дзесяцігоддзяў супрацоўніцтва?

— Удалося не страціць тое, што нас звязвала, калі мы былі адной з саюзных рэспублік. У Індыі нас дасюль памятаюць і добра ведаюць. Яны ведаюць, што мы дружалюбная краіна, ва ўсе часы Беларусь (і ў складзе СССР, і як незалежная дзяржава) дапамагала Індыі. Наша дзяржава выклікае шчырую цікавасць і павагу. Індыю прывабліве шчырасць адносін, надзейнасць, гарантавана высокая якасць прадукцыі, якую мы пастаўляем. Насамрэч за 30 гадоў удалося шмат дасягнуць. Адбыліся тры візіты Аляксандра Лукашэнкі ў Індыю. У 2017-м да нас прыязджаў прэзідэнт Індыі. Варта згадаць і візіты кіраўніцтва міністэрстваў, ведамстваў, парламента. Былі дасягнуты важныя дамоўленасці, напрацавана значная дагаворна-прававая база. Мы разглядаем Індыю як стратэгічнага партнёра ў гэтым рэгіёне. Уся наша дзейнасць накіравана на тое, каб пашырыць і паглыбіць узаемадзеянне. У нас цесныя палітычныя адносіны, мы аказваем адзін аднаму падтрымку ў сусветных арганізацыях, варта хоць бы згадаць пазіцыю Індыі падчас нядаўняй справаздачы ІКАО па інцыдэнце з рэйсам Ryanair. Не варта забываць пра тое, што Індыя стаяла каля вытокаў Руху недалучэння, куды ўваходзіць і Беларусь.

Фота Лізаветы ГОЛАД.

Аб'ём беларуска-індыйскага тавараабароту наблізіўся да 600 мільёнаў долараў, нам удалося атрымаць практычна 400 мільёнаў долараў экспарту, дадатнае сальда значна больш за 200 мільёнаў долараў. Калійныя ўгнаенні — значная пазіцыя, на якую прыпадала да 70 працэнтаў аб'ёму нашага экспарту. Мы імкнёмся да таго, каб яго структура станавілася больш разнастайнай, адыходзім ад моназалежнасці. За апошнія тры гады асартымент паставак пашырыўся на 39 пазіцый. Імкнёмся змяніць тэндэнцыю, выходзім на іншыя групы тавараў, якія, спадзяюся, зойміуць значны працэнт экспарту.

— Гэта ў тым ліку датычыцца сельскагаспадарчай прадукцыі?

— Сухое малако запатрабаванае, іншыя малочныя прадукты. Ёсць зацікаўленасць у пастаўках не толькі ў Індыі, а і ў суседніх краінах. Напрыклад, у Бангладэш запатрабаваныя паставы дзіцячага харчавання на аснове якаснага беларускага малака. Там нават ёсць зацікаўленасць у тым, каб стварыць адпаведны сумесны праект. Усё гэта ў стадыі прапрацоўкі. Вялікая надзея на адну з найбуйнейшых у Паўднёвай Азіі выставак у сферы прадуктаў харчавання Indus Food 2022, якую плануецца правесці ў лістападзе ў Нью-Дэлі з шырокім удзелам нашых прадпрыемстваў. Спадзяюся, што да гэтага часу адкрыецца прамы рэйс Мінск—Нью-Дэлі. Будзе нашмат прасцей дабірацца.

Я лічу, што вытворцам варта выходзіць з насамрэч унікальным, беларускім брэндам. Гэта можа быць як малочная прадукцыя, так і традыцыйныя напоі, той жа квас, які выдатна спаталяе смагу і ў такой гарачай краіне, як Індыя, можа карыстацца вялікім попытам. Напрыклад, у Паўднёвай Карэі, клімат якой супастаўны з індыйскім, ёсць некалькі так званых рускіх крам, дзе ў тым ліку прадаецца беларускі квас і карыстаецца значнай папулярнасцю.

— Актывізаваліся паставы на індыйскі рынак беларускай сельгастэхнікі, у тым ліку трактароў «Беларус», якія, дарэчы, доўгі час тут не прысутнічалі. У чым прычына?

— Індыйскі рынак сельгастэхнікі досыць жорсткі. Тут выпускаецца шэраг брэндаў як уласнай вытворчасці, так і асноўных сусветных вытворцаў. Канкурэнцыя надзвычай высокая, асабліва ў дыяпазоне магутнасці ад 40 да 80 конскіх сіл. Гэта самы канкурэнтны сегмент рынку. Але ж брэнд трактара «Беларус» мае свае перавагі — ён «раскручаны» яшчэ з савецкіх часоў. Яго добра памятаюць і цэняць індыйскія фермеры. Таму адна з кампаній вырашыла паспрабаваць паставіць трактары, і справа пайшла: калі летась закупілі тры, то сёлета — ужо 12. Попыт ёсць, ёсць бачанне, якім чынам працягваць гэты бізнес. Магчыма, будуць агульныя праекты з індыйскім бокам. Гаворка ідзе пра тое, каб стварацъ сумесную вытворчасць пад маркай «Беларус».

15-20 гадоў не было паставак нашых трактароў. Раней закуплялі іншыя маркі, аднак цяпер індыйскія ўлады ўзялі курс на самадастатковую ў плане ўласнай вытворчасці краіну. Асабліва пасля зняцця ковідных абмежаванняў. Кіраўніцтва краіны зразумела, што варта больш пазіцый вырабляць самім. Таму цяпер актыўна развіваецца дзяржпраграма «Зроблена ў Індыі». Многія краіны ў ёй удзельнічаюць, стварацца сумесныя праекты. Мы таксама мяркуем актыўна далучыцца. Індыя — акно бязмежных магчымасцяў, якімі варта скарыстацца.

— А як БелАЗ сябе пачувае на індыйскім рынку?

— БелАЗ застаецца адной з найбольш перспектыўных пазіцый. Тым больш цяпер, падчас вострага недахопу вуглевадародаў, які склаўся ва ўмовах санкцый, калі Індыя раскансервавала вугальныя станцыі. Патрэба ў вугалі проста каласальная. Адпаведна, ёсць значны попыт на БелАЗы. Наша тэхніка належным чынам адаптавана для работы ва ўмовах вільготнага і гарачага клімату. БелАЗ упэўнена выйграў два тэндары: у 2019 годзе на 77 кар'ерных самазвалаў грузападымальнасцю 130 тон, а летась на 96 220-тонных машын.

ААТ «Гомсельмаш» сумесна з кампаніяй DVR Infratech Private Limited у чэрвені 2017-га стварыла ў Індыі СП «Гомсельмаш-Індыя». У 2017—2018 гадах вытворчае аб'яднанне «Беларуснафта» паспяхова ажыццявіла два сумесныя праекты ў галіне павышэння нафтааддачы пластоў на радовішчах Дыгбой і Чабуа (штат Асам). А ў пачатку лютага 2020-га падпісаны кантракт з індыйскай дзяржаўнай нафтагазавай карпарацыяй ONGC на падбор рэцэптуры паверхнева-актыўных рэчываў (ПАР) для павышэння нафтааддачы пластоў на шасці індыйскіх радовішчах.

— Якім чынам развіваецца інвестыцыйнае супрацоўніцтва?

— Тэндэнцыі пазітыўныя — летась прыток прамых інвестыцый з Індыі істотна вырас. Тут варта згадаць супрацоўніцтва ў фармацэўтычнай сферы: з удзелам індыйскага боку рэалізоўваюцца тры праекты, яшчэ адзін — у стадыі актывізацыі. Ёсць яшчэ некалькі вельмі актыўных напрацовак з найбуйнейшымі індыйскімі вытворцамі як субстанцый, так і гатовай прадукцыі, у тым ліку паўфабрыкатаў, інгрыдыентаў вытворчасці. Плануецца стварыць у Беларусі сучасную вытворчасць па найноўшых тэхналогіях з выкарыстаннем індыйскага капіталу. Цяпер вядуцца перагаворы, ёсць шанц, што мы да канца года выйдзем на практычныя зрухі.

Нарошчваецца экспарт паслуг. Вялікі перспектыўны напрамак — адукацыйныя паслугі. Колькасць індыйскіх студэнтаў, якія навучаюцца ў беларускіх ВНУ, у прыватнасці па медыцынскім профілі, штогод павялічваецца. У 2021/2022 навучальным годзе ў ВНУ Беларусі на платнай аснове навучалася каля 900 індыйскіх грамадзян.

— Некалькі гадоў таму ў Беларусі з удзелам індыйскіх партнёраў меркавалася стварыць індустрыяльны парк. Што з гэтым праектам?

— Мы доўга прапрацоўвалі адпаведнае пытанне, гэта адзін з пунктаў пратакола даручэнняў Прэзідэнта. Сучасны мультымадальны індустрыяльны парк прапаноўвалася стварыць на базе асаблівай эканамічнай зоны «Брэміна-Орша». Мы зрабілі некалькі прэзентацый для індыйскага боку, у тым ліку ў межах дзясятай міжурадавай камісіі 4-5 сакавіка 2020 года (літаральна напярэдадні ўвядзення ковідных абмежаванняў), калі быў праведзены першы беларуска-індыйскі інвестыцыйны форум. Адзначаўся пэўны інтарэс з боку індыйскіх кампаній да праекта. Паколькі меркавалася атрыманне заўважных эканамічных ільгот, што было замацавана адпаведным указам Прэзідэнта. Аднак пандэмія і абмежаванні ў тым ліку для бізнесу прыпынілі гэты працэс. Але мы не адмаўляемся ад перспектыўнай ідэі, усяляк прасоўваем яе. Тым больш што яна падмацавана фінансамі — існуе крэдытная лінія, якая была выдзелена ў 2015 годзе ў рамках першага візіту прэзідэнта Індыі ў Беларусь.

— Значнага змяншэння аб'ёму беларуска-індыйскага тавараабароту з-за пандэміі і санкцый не адбылося. Як удалося захаваць узровень?

— Вялікія напрацоўкі былі ў 2019 годзе, вялікія планы на 2020-ты. З аб'ектыўных прычын не ўсё ўдалося рэалізаваць, але ж здолелі захаваць узровень экспарту. Ва ўмовах пандэміі наладзілі перамяшчэнне неабходных нашых спецыялістаў на спецыяльных авіярэйсах, яны ў Індыі называюцца «мыльныя бурбалкі». Для асобных катэгорый грамадзян прадугледзелі магчымасць пазбегнуць карантыну, вядома, пры наяўнасці адпаведных сертыфікатаў аб вакцынацыі. Таму людзі прыязджалі, працавалі, праводзілі перагаворы. Былі арганізаваны відэаканферэнцыі. Пасольства не прыпыняла работу, дапамагалі ўсім. Летась было яшчэ цяжэй, паколькі Індыя спынілася практычна на два месяцы. Людзі паміралі тысячамі, усё было зачынена. Усе імкнуліся выжыць. Але ж і летась катастрафічнага згортвання паставак не адбылося, экспарт прасеў літаральна на некалькі працэнтаў. Мы мэтанакіравана рушым да запаветнага мільярда долараў тавараабароту, робім дзеля гэтага ўсё магчымае.

— Вялікія спадзяванні ў плане актывізацыі двухбаковага супрацоўніцтва ўскладаюцца на візіт у Беларусь прэм'ер-міністра Індыі Нарэндры Модзі. Калі ён адбудзецца?

— Візіт Нарэндры Модзі ў Беларусь плануецца на 2020 год, аднак з аб'ектыўных прычын не адбыўся, паколькі з пачаткам пандэміі каранавіруса ўсё змясцілася. Цяпер плануецца, што візіт кіраўніка Індыі мае адбыцца ў канцы гэтага альбо ў першай палове наступнага года.

— Як развіваецца культурнае супрацоўніцтва, у тым ліку ў кінавытворчасці? Я чуў, што з Балівудам актыўна працуем...

— Надзвычай перспектыўнае супрацоўніцтва ў культурнай галіне. Шмат разнастайных праектаў рэалізоўваецца, у тым ліку ў кінаіндустрыі. Сёлета ў Індыі прайшоў фестываль беларускага кіно. У канцы 2019 года ў нашу краіну прыязджала індыйская здымачная група. Здымалі кіно — такім чынам з'явілася карціна «Атрад» з беларускімі краявідамі. Яна была паказана ў пачатку гэтага года на Netflix. Фільм добра прыняты індыйскай аўдыторыяй. У індыйцаў ёсць імкненне прыехаць на новыя кінапраекты ў Беларусь. І мы ў гэтым зацікаўлены, паколькі выдатна разумеем, што фільмы — адзін з механізмаў пазнання краіны. У Індыі вельмі папулярна праз кіно даведвацца пра іншыя дзяржавы, а пасля наведваць пэўныя мясціны. Іншыя краіны нават прадастаўлялі на льготных умовах свае здымачныя пляцоўкі, а пасля ўзрастаў паток індыйскіх турыстаў. Адна з важных задач — развіццё ўязнога турызму, гэтым актыўна займаемся. У Індыі адкрыта прадстаўніцтва беларускай кампаніі «Белінтрэвэл». Ёсць візавыя цэнтры, з якімі мы супрацоўнічаем. Нацэленыя на пашырэнне супрацоўніцтва і ствараем умовы для прыцягнення гасцей. Індыйскія турысты, якія маюць пашпарт з адкрытай шэнгенскай візай, могуць ехаць у Беларусь да 30 дзён без візы. Думаю, калі адкрыецца прамы авіярэйс, то паток турыстаў заўважна ўзрасце, у абодвух кірунках, паколькі беларусы таксама актыўна цікавяцца Індыяй.

— Акрамя Індыі, у зоне вашай адказнасці яшчэ некалькі суседніх краін. Як з імі супрацоўнічаем?

— Найбольш актыўна развіваецца супрацоўніцтва з Бангладэш. Рэальна заўважна, што гэтая краіна развіваецца. Там праводзіцца значнае інфраструктурнае будаўніцтва — узводзяцца дарогі, будынкі. Таму ёсць вялікі патэнцыял для пашырэння паставак нашай дарожна-будаўнічай тэхнікі, у прыватнасці, «Амкадора», МАЗа, сельгастэхнікі. Прасоўваецца праект па стварэнні вялікага прадстаўніцтва нашай прамысловасці ў Бангладэш, куды маглі б увайсці МТЗ, МАЗ, «Белкамунмаш», «Амкадор». Плануецца стварэнне мультымадальнага гадлёвага дома, які дазваляў бы не толькі прадаваць, але і арганізоўваць абслугоўванне тэхнікі. Гэта вялікі перспектыўны праект, які разлічаны на працяглую прысутнасць у гэтай краіне.

З Непалам складаней, як правіла, яны гатовыя працаваць на ўмовах канцэсіі. Былі напрацоўкі па пастаўках беларускай дарожнай тэхнікі. У краіне разгарнулася вялікая будоўля ў горнай мясцовасці — узводзяцца дарогі, масты, тунэлі. Аднак пакуль не выйшлі на канкрэтныя дамоўленасці. У Непал плануецца візіт нашай дэлегацыі. Па Шры-Ланцы праекты замарожаны, паколькі цяпер краіна знаходзіцца ў стадыі банкруцтва. Таксама ёсць яшчэ Мальдывы, Бутан, якія самі нічога практычна не вырабляюць. На Мальдывах адбываецца вялікая будоўля, таму існуе тэарэтычны попыт на нашу тэхніку. Так што трэба працаваць, шукаць нішы, тады і вынік належны будзе. Рэгіён надзвычай перспектыўны.

Гутарыў Мікалай ЛІТВІНАЎ.

Поўны тэкст чытайце на сайце zviazda.by.

Жніво-2022

ЗА ШТУРВАЛАМ — «ТЫСЯЧНІКІ»

Лідараў-хлебаробаў ушанавалі ў Рэчыцкім і Добрушскім раёнах

Запаветныя рубяжы ў тысячу тон намалочанага і перавезенага збожжа ў канцы мінулага тыдня пакарыліся экіпажу гаспадаркі «Савецкая Беларусія» — філіялу ААТ «Рэчыцкі камбінат хлебапрадуктаў». «Тысячнікі» жніва — камбайнер Уладзімір ДАРАФЕЙ і кіроўца Ігар ЦЫЦАРАЎ *(на здымку)* — літаральна ў полі прымалі віншаванні і падарункі ад старшыні Гомельскага аблвыканкама Івана КРУПКО.

Фота ТК «Гомельскія ведамасці».

Імправізаваная сцэна для ўшанавання лідараў жніва разгарнулася на хлебнай ніве каля аграгарадка Заспа, што ў Рэчыцкім раёне. Камбайнер Уладзімір Дарафей першую ў рэгіёне тысячу тон збожжа новага ўраджаю намалаціў на новенькім газаматорным камбайне GS-4118K з гомельскай прапіскай. Адкрыў адлік ужо на другую тысячу тон перавезенага збожжа новага ўраджаю вадзіцель МАЗ-5551 Ігар Цыцараў.

Падтрымаць аграрыяў, што цяпер на перадавой жніва, у поле прыехалі **генеральны дырэктар ААТ «Гомсельмаш» Аляксандр НОВІКАЎ, старшыня Гомельскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў Аляксей НЯВЕРАЎ** і **лідар абкама Беларускага прафсаюза работнікаў аграпрамысловага комплексу Аляксандр НАЎНЫКА.**

— Мая работа — гэта маё жыццё. Ні дня не было такога, каб я засумняваўся, каб хацелася пайсці ў іншае месца. На работу заўсёды іду з пазітывам, — коратка расказаў камбайнер гаспадаркі «Савецкая Беларусія» Уладзімір Дарафей.

Некалькі соцень метраў на камбайне побач з першым «тысячнікам» Гомельшчыны праехаў і кіраўнік рэгіёна Іван Крупко.

— У вашых мазольных руках — харчовая бяспека краіны, — звярнуўся да байцоў жніва старшыня аблвыканкама. — З улікам ста новых камбайнаў, якія цяпер атрымаем, іх будзе задзейнічана тысяча, больш за тысячу машын — на адвозцы хлеба. Калі ў тандэме ўсё дакладна працуе — уборка, адвозка, дапрацоўка збожжа, што кладзецца ў засекі, у дзяржзаказ, для забеспячэння жывёлагадоўлі, — зробім своечасова, — матывуе аграрыяў Гомельшчыны губернатар.

Высокія тэмпы ўборачнай паказваюць гаспадаркі Добрушскага, Брагінскага раёнаў. Сярод традыцыйных перадавікоў жніва — ААТ «Калінінскі» Добрушскага раёна, дзе ўшанавалі тры экіпажы камбайнераў-тысячнікаў і столькі ж «тысячнікаў»-вадзіцеляў. Гаспадарка — лідар свайго раёна не толькі па колькасці хлебаробаў, якія перасягнулі тысячны рубеж па ўборцы і адвозцы збожжа ад камбайнаў, але і па намалоце хлеба новага ўраджаю. Дарэчы, менавіта камбайнеры акцыянернага таварыства «Калінінскі» летась на абласных «Дажынках» заваявалі ўсе дыпломы ў адной з намінацый за дасягненні на ўборцы збожжавых і зернебабовых культур.

Лідары гаспадаркі — Сяргей Белавусаў, Пётр Самойленка і Мікалай Варганаў — тады паказалі ўражальны агульны вынік: больш чым шэсць тысяч тон намалочанага хлеба.

— Працуем, працуем і працуем. З раніцы выязджаем усе разам. Дух спаборніцтва ёсць, але працуем без зайздрасці, сумленна, — падзяліўся камбайнер-«тысячнік» Мікалай Варганаў.

Пра больш як дваццацігадовую працу за штурвалам камбайна расказаў і старшы камбайнер ААТ «Калінінскі» Пётр Самойленка:

— Асабісты рэкорд разам з кукурузай — больш як тры тысячы тон. Ніколі менш за дзве тысячы тон я не намалочваў.

Гэтымі днямі адлік «тысячнікаў» на адвозцы зерня адкрылі хлебаробы ААТ «Чамярыскі» Брагінскага раёна. Гэтая гаспадарка лідзіруе ў раёне па тэмпах жніва. Запаветны рубеж у тысячу тон перавезенага збожжа трэці год запар на рахунку Канстанціна Алішэўскага. Малады кіроўца — сярод лідараў адразу ў двух заліках — агульным і сярод моладзі.

Між тым зараз на Гомельшчыне завяршаецца ўборка азімага рапсу. Восем раёнаў поўнасцю разлічыліся па здачы ў лік дзяржзаказу насення гэтай культуры. Гаспадаркамі рэгіёна ўбрана трэць плошчаў збожжавых каласавых: сярэдняя ўраджайнасць на два цэнтнеры з гектара вышэйшая за леташні паказчык.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

Надвор'е

Апошняя хваля летняй спёкі?

У пятніцу і суботу сіноптыкі абяцаюць нават 32—33 градусы

А ў мінулыя выхадныя на тэрыторыі нашай краіны было не толькі халаднавата, але і дажджліва. У нядзелю Беларусь знаходзілася ў арбіце ўплыву цыклону Frieda і яго актыўных атмасферных франтоў. Ссоўваючыся ўздоўж заходніх межаў, цыклон прынёс дажджы рознай інтэнсіўнасці, месцамі нават паспелі прагрымець навальніцы. Аднак больш за ўсё нябеснай вільгаці дасталося заходнім рэгіёнам. Разам з тым тэмпературны фон у Беларусі быў даволі кантрасным і вагаўся ад плюс 18 градусаў па паўночным захадзе да плюс 29 градусаў па паўднёвым усходзе. На гэтым тыдні нас чакае пацяпленне і памяшэнне колькасці дажджоў, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Сёння ў другой палове дня пераважна па ўсходняй палове пройдуць кароткачасовыя дажджы. Месцамі чакаюцца навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 12—17 градусаў, а максімальная тэмпература днём дасягне плюс 22—28 градусаў.

У сераду надвор'е будзе пераважна без ападкаў. Толькі ў асобных раёнах па паўднёвым усходзе краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы з навальніцамі. Уначы і раніцай месцамі будзе слабы туман. Ноччу тэмпература паветра будзе плюс 8—14 градусаў, а па паўднёвым усходзе дасягне плюс 17 градусаў. Удзень паветра прагрэецца да плюс 22—27 градусаў.

Суперцёплыя дні прыйдуць да нас ужо ў чацвер. У гэты дзень прагназуецца пераважна без ападкаў. У начныя і ранішнія гадзіны месцамі магчымы слабы туман. Тэмпература паветра ўначы плюс 8—15 градусаў, а па паўднёвым усходзе — плюс 17 градусаў. Днём слупок тэрмометра падымецца ад плюс 25 градусаў да 30 цяпла.

Самы гарачы дзень на гэтым тыдні — у пятніцу. Спецыялісты чакаюць, што 5 жніўня будзе пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай у асобных раёнах краіны слабы туман. У начныя гадзіны тэмпература паветра будзе трымацца на ўзроўні плюс 12—18 градусаў, а днём паветра прагрэецца да 26—33 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у суботу спякота злёгку адпусціць. У гэтыя суткі ноччу па захадзе, а днём на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі магчымы навальніцы. Уначы тэмпература паветра складзе плюс 14—20 градусаў, удзень будзе вагацца ад плюс 20 градусаў па паўночным захадзе да плюс 32 градусаў па паўднёвым усходзе краіны.

Спякота пачне адступаць па ўсёй тэрыторыі краіны толькі ў нядзелю. У гэты дзень месцамі па Беларусі сіноптыкі абяцаюць кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад плюс 9 градусаў па паўночным захадзе да плюс 18 градусаў па паўднёвым усходзе краіны. Максімальная тэмпература днём будзе ад плюс 20 градусаў па паўночным захадзе да 28 цяпла па паўднёвым усходзе краіны.

Сяргей КУРКАЧ.

ІХ ЗМАЛКУ ЦЯГНУЛА ДА ТЭХНІКІ...

Ва ўрочышчы Дуброва, сярод лесу — шырокае жытнёвае поле. Сонца ўжо хіліцца на захад, спадае гарачыня, але ўборка ідзе поўным ходам: шчыруе некалькі камбайнаў.
За штурвалам аднаго — вопытны сямейны экіпаж Наталлі і Аляксандра КІВАЧУКОЎ *(на здымку)*. Для Наталлі гэта ўборачная кампанія дзясятая па ліку. Першыя пяць сезонаў яна адпрацавала з бацькам Юрыем Парчэўскім. Цяпер Наталля — адзіная жанчына ў Маларыцкім раёне, хто працуе памочнікам камбайнера.

— Вось убачыла ў жыце валошкі і не ўтрымалася — папрасіла мужа спыніць камбайн, нарвала букет. Любата, праўда?!

Муж, зразумела ж, згаджаецца, бо ведае, што добры настрой толькі на карысць іх агульнай справе. Як і вопыт, майстэрства, пастаяннае адчуванне надзейнага пляча — разуменне з паўслова. За пяць гадоў сямейны экіпаж Ківачукоў намалаціў больш за 1031 тону рапсу, больш за 6 600 тон — збожжа.

Сёлетняе жніво пачалося для сужэнцаў 15 ліпеня. Спачатку яны ўбіралі рапс, потым «пераключыліся» на збожжа. На камбайне «Тукана-430» сямейны экіпаж толькі за два дні ўборкі — 2022 намалаціў амаль 116 тон зерня.

— Аляксандр Сяргеевіч, а тысячу тон сёлета намалоціце? — пытаемся ў камбайнера.

— Хацелася б. Але ж мы не ставім перад сабой нейкіх высокіх планак. Для нас з жонкай галоўнае своечасова і без страт убраць вырашчаны ўраджай. А на ўмалот уплывае шмат фактараў, у тым ліку і тыя, якія ад нас не залежаць. Вельмі важна, каб не псаваўся камбайн, каб падчас уборкі не было дажджоў.

— А як вы аказаліся на камбайне? — цікавімся ў Наталлі Юр'еўны.

— Мяне змалку цягнула да тэхнікі, хацелася пакруціць стырно аўтамабіля, «пабуркаць». З лялькамі я амаль не гуляла, — прызнаецца Наталля. — За рулём з 12 гадоў. У старэйшых класах хадзіла на заняткі ў вучэбна-вытворчы камбінат пры Олтушскай сярэдняй школе, атрымала катэгорыю «А», што дало права кіраваць колавымі трактарамі...

Але ж да іх тады справа не дайшла. Пасля школы Наталля паступіла вучыцца на філалагічны факультэт Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта, атрымала дыплом настаўніцы беларускай мовы і літаратуры, потым набыла спецыяльнасць настаўніка-дэфектолага. Па ёй і працуе ў Олтушскім дзіцячым садку. А на час водпуску ўжо дзясяты год ідзе ў памочнікі камбайнера.

Адважыцца на гэта дапамог выпадак. Неяк у пачатку лета бацька Наталлі рыхтаваў да ўборкі камбайн. Механізатараў тады не хапала, аднаму, казаў, працаваць цяжка. І таму хутчэй жартам ён спытаў: «Можа, ты, дачушка, пойдзеш да мяне ў памочнікі?» Як і варта было чакаць, дачушка адразу ж згадзілася.

— Спачатку, — прызнаецца, — хвалявалася, думала, што не спраўлюся з такой вялікай хлебаўборачнай машынай. Але побач быў бацька. Я пераймала вопыт. У 2015 годзе прайшла курсы перападрыхтоўкі, адкрыла катэгорыю «D».

Цяпер Наталлю Ківачук ва ўсім падтрымлівае муж. Яго таксама змалку цягнула да тэхнікі. Пасля школы скончыў ПТВ-155. З Наталляй пазнаёміўся, калі прыехаў з сябрам у вёску Дворышча. Ужо пры першай сустрэчы маладыя спадабаліся адно аднаму і неўзабаве згулялі вяселле. Кіраўніцтва калгаса «Перамога», куды Аляксандр прыйшоў працаваць трактарыстам, выдзеліла маладой сям'і дом. У ім — не паспелі агледзецца — выросла дачка, скончыла школу, паспяхова здала ЦТ, стала студэнткай. А вось камбайнерам...

Пажывём — пабачым.

Мікалай НАВУМЧЫК, фота аўтара.

Извещение о проведении 16 августа 2022 года повторных аукционных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС»

Сведения о продаваемом имуществе (предмете торгов)				
№ предмета торгов	Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества	Сведения о земельном участке	Начальная цена, бел. руб., с учетом НДС	Размер задатка, бел. руб.
1	Капитальное строение с инв. номером 500/С-41939 общей площадью 668,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 12А/1, наименование – литер Б1/к. Здание специализированное складов, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; капитальное строение с инв. номером 500/С-41940 общей площадью 635,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 12А, наименование – литер А1/к. Здание специализированное складов, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; капитальное строение с инв. номером 500/С-41941 общей площадью 289,1 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 12А/2, наименование – здание специализированное складов, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; капитальное строение* с инв. номером 500/С-41942 общей площадью 201,5 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 12А/3, наименование – литер Г1/бл. Здание специализированное складов, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	Площадь – 0,8374 га, кадастровый номер – 500000000004002829	1 018 560,00	101 000,00
2	Капитальное строение* с инв. номером 500/С-44605 общей площадью 843,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Суражская, 15, наименование – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (литер А1/к, д), назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	Площадь – 0,3087 га, кадастровый номер – 500000000005003710	498 240,00	49 000,00
3	Капитальное строение с инвентарным номером 633/С-10565 общей площадью 66,3 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Мядельский р-н, Будславский с/с, п. Будслав, наименование – магазин № 50, назначение – здание специализированное розничной торговли	Площадь – 0,0395 га, кадастровый номер – 624080602101000023	3 936,00	393,00
4	Капитальное строение с инв. номером 633/С-10564 общей площадью 64,1 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Мядельский р-н, Княгининский с/с, аг. Княгинин, ул. Привокзальная, д.81, наименование – магазин № 42, назначение – здание специализированное розничной торговли	Площадь – 0,0379 га, кадастровый номер – 624082004601000184	4 512,00	451,00
5	Капитальное строение с инв. номером 410/С-27187 общей площадью 444,4 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Волковысский р-н, г. Волковыск, ул. Новые Борки, 1/1, склад, наименование – склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; капитальное строение с инв. номером 410/С-26719 общей площадью 75,6 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Волковысский р-н, г. Волковыск, ул. Новые Борки, 1/2, наименование – склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; капитальное строение с инв. номером 410/С-26718 общей площадью 25,9 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Волковысский р-н, г. Волковыск, ул. Новые Борки, 1, наименование – контора склада, назначение – здание административно-хозяйственное	Площадь – 0,2816 га, кадастровый номер – 420850100001006901	42 700,00	4 270,00
6	Капитальное строение с инв. номером 630/С-65814 общей площадью 94,9 кв. м (наименование – бухгалтерия-склад, назначение – здание неустановленного назначения); капитальное строение с инв. номером 630/С-65813 общей площадью 122,8 кв. м (наименование – кондитерский цех, назначение – здание неустановленного назначения); капитальное строение с инв. номером 630/С-65811 общей площадью 157,6 кв. м (наименование – склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ); капитальное строение с инв. номером 630/С-65816 общей площадью 42,0 кв. м (наименование – административное здание, назначение – здание административно-хозяйственное), расположенные по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Вокзальная, 4; капитальное строение с инв. номером 630/С-79669 протяженностью подземной прокладки 4,10 м (наименование – водопроводные сети, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения), расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Вокзальная	Площадь – 0,1382 га, кадастровый номер – 623850100003001899	13 063,79	1 300,00
7	Капитальное строение с инвентарным номером 413/С-528 общей площадью 48,1 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Свислочский р-н, Порозовский с/с, г. п. Порозово, ул. Ленина, 12, наименование – автостанция, назначение – здание специализированное автомобильного транспорта; капитальное строение с инвентарным номером 413/С-529 общей площадью 13,4 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Свислочский р-н, Порозовский с/с, г. п. Порозово, ул. Ленина, 12/1, наименование – сарай, назначение – здание нежилое	Площадь – 0,0446 га, кадастровый номер – 425255700001000037	12 864,00	1 280,00
8	Капитальное строение с инвентарным номером 420/С-27097 общей площадью 89,3 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, Гончарский с/с, д. Селец, ул. Молодежная, 11А, наименование – магазин № 60, назначение – здание специализированное розничной торговли	Площадь – 0,1052 га, кадастровый номер – 423682707164000024	6 144,00	610,00
9	Изолированное помещение** с инв. номером по бухгалтерскому учету 088554 общей площадью 169,2 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Станционная, 1-17, наименование – торговое помещение, назначение – торговое помещение	-	9 252,00	920,00
10	Капитальное строение с инв. номером 240/С-44733, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Щетинковская, 39А, общей площадью 1422,1 кв. м; наименование – здание склада с теневым навесом; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	Площадь – 0,4652 га, кадастровый номер – 223650100001016130	21 907,68	2 190,00
11	Капитальное строение с инв. номером 240/С-45976 общей площадью 115,9 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Межевский с/с, аг. Заполье, ул. Станционная, 2, наименование – здание магазина № 61, назначение – здание специализированное розничной торговли; капитальное строение** с инв. номером по бухгалтерскому учету 084792 общей площадью 22,0 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Межевский с/с, аг. Заполье, ул. Станционная, 2/1, наименование – здание склада	Площадь – 0,0370 га, кадастровый номер – 223684400001000005	1 826,89	180,00
12	Капитальное строение* с инв. номером 110/С-113573, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское Шоссе, 20А, общей площадью 1 181,8 кв. м, наименование – здание промбазы, назначение – здание специализированное иного назначения	Площадь – 0,1607 га, кадастровый номер – 141000000001005239	53 280,00	5 300,00
13	Капитальное строение с инв. номером 110/С-117135, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское Шоссе, 20А/2, общей площадью 684,9 кв. м, наименование – здание арочного склада, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	Площадь – 0,2340 га, кадастровый номер – 141000000001005245	19 920,00	1 900,00
14	Капитальное строение с инв. номером 110/С-117137, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/9, общей площадью 855,6 кв. м, наименование – овощной склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	Площадь – 0,1865 га, кадастровый номер – 141000000001005217	40 800,00	4 000,00
15	Капитальное строение* с инв. номером 110/С-114895, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/10, общей площадью 737,0 кв. м, наименование – здание овощехранилища, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	Площадь – 0,1753 га, кадастровый номер – 141000000001005244	35 280,00	3 500,00
16	Капитальное строение с инв. номером 110/С-117138, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/11, общей площадью 775,1 кв. м, наименование – овощехранилище, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	Площадь – 0,2055 га, кадастровый номер – 141000000001005211	32 640,00	3 200,00
17	Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-117143, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/12, общей площадью 212,7 кв. м, наименование – здание столярного цеха, назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель	Площадь – 0,0548 га, кадастровый номер – 141000000001005212	10 656,00	1 000,00
18	Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-114896, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/13, общей площадью 218,6 кв. м, наименование – здание лукохранилища, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	Площадь – 0,0656 га, кадастровый номер – 141000000001005213	10 368,00	1 000,00
19	Капитальное строение с инв. номером 110/С-117145, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/15, общей площадью 703,6 кв. м, наименование – здание склада, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	Площадь – 0,2034 га, кадастровый номер – 141000000001005243	32 880,00	3 200,00
20	Капитальное строение с инв. номером 110/С-117140, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/16, общей площадью 227,5 кв. м, наименование – здание коптильного цеха, назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака	Площадь – 0,1566 га, кадастровый номер – 141000000001005214	10 800,00	1 000,00
21	Капитальное строение с инв. номером 110/С-117139, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/17, общей площадью 317,2 кв. м, наименование – склад шиферный, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	Площадь – 0,1457 га, кадастровый номер – 141000000001005215	9 528,00	950,00
22	Капитальное строение* с инв. номером 640/С-68377 общей площадью 337,9 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Ленина, 94А, наименование – торгово-производственный комплекс, назначение – здание многофункциональное	Площадь – 0,2462 га, кадастровый номер 642500000001000231	303 600,00	30 000,00
Продаваемое имущество выставлено на торги по фактическому состоянию, техническим характеристикам и комплектации. Рекомендуется проведение осмотра				

** Имеется ограничение (обременение): аренда.*

*** Согласно подпункту 9.1 пункта 9 Указа Президента Республики Беларусь от 31.12.2018 № 506 «О развитии Оршанского района Витебской области» отчуждение расположенных на территории Оршанского района объектов недвижимого имущества, находящихся в государственной собственности и собственности юридических лиц, более 50 процентов акций (долей в уставных фондах) которых находится в государственной собственности, либо входящих в состав холдингов с участием государства, может осуществляться без наличия технических паспортов, а также документов, удостоверяющих государственную регистрацию прав на данное имущество.*

Продавец имущества: ОАО «ДОРОРС», ул. Брестская, 77/1-2, 220099, г. Минск.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условия торгов: победитель торгов (покупатель) в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона:

по предметам торгов **№№ 1–5, 7–21** в размере 2 (двух) процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов;

по предмету торгов **№№ 6, 22** в размере 3 (трех) процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток (задатки) и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков), документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» р/с BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах от 16.08.2022.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **16 августа 2022 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов).

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 03.08.2022 по 12.08.2022** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону (017) 240-62-06.

Телефоны для справок: (017) 360-42-22, 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 240-62-06 (ОАО «ДОРОРС»).

Дополнительная информация размещена на сайте **www.mgcn.by** в разделе «Недвижимость в собственность».

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА С УЧЕТОМ ПОНИЖЕНИЯ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

ОАО «РАДИОВОЛНА»

Предмет торгов, краткая характеристика	**Лот № 1 – капитальное строение, инв. № 400/U-162753** (незавершенное законсервированное капитальное строение) общей площадью 6520,4 кв. м, стены – панели железобетонные, кирпич силикатный, инженерные системы отсутствуют; **капитальное строение, инв. № 400/С-163014** (благоустройство) общей площадью 474,0 кв. м, 1990 г. п.
Информация о земельном участке	Кадастровый номер 440100000002011232, площадь – 0,6679 га, назначение – для строительства и обслуживания здания и сооружений, право аренды по 27.10.2051 г. При переходе права собственности на незавершенное законсервированное капитальное строение и права аренды на земельный участок, возможно использование их новым собственником для размещения промышленных предприятий, транспортной и инженерной инфраструктуры, коммунальных, коммунально-складских и складских объектов, обеспечивающих функционирование этих предприятий
Местонахождение имущества: Гродненская обл., г. Гродно, ул. М. Горького, 89 Б	
Начальная цена с учетом НДС: 1 181 768 рублей 40 копеек	Задаток (5 %) – 59 088,00 руб.

Сведения о продавце: ОАО «Радиоволна», г. Гродно, ул. Горького, 89, тел. 8 (0152) 626648	
Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка: Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8 (0152) 621632, УНП 500481906, номер счета BY65BLBB30150500481906001002 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской обл., код BLBBBY2X	
Срок заключения договора купли-продажи: в течение 15 рабочих дней с момента проведения торгов. Условия оплаты: в течение 30 календарных дней с момента заключения договора купли-продажи	
Торги состоятся 7 сентября 2022 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8	
Срок подачи документов	**По 1 сентября 2022 года включительно до 16.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8**
Условия участия и порядок проведения аукциона размещены на сайте www.fincentr.by, тел. для справок 8 (0152) 621632	
Предыдущие публикации: *газета «Звязда» от 27.11.2021 г., от 28.01.2022 г., 24.02.2022 г., 06.04.2022 г., 09.06.2022 г.*	

КОЛЬКАСЦЬ ПАКУПНІКОЎ РАСЦЕ, АЛЕ ЦЭНЫ ПРАЦЯГВАЮЦЬ ЗНІЖАЦЦА

Рэкордная колькасць здзелак — значыць з шокам справіліся

Як высветлілі аналітыкі партала Realt, у першым месяцы лета ў Мінску было здзейснена 1385 здзелак куплі-продажу кватэр. Гэта рэкорд для чэрвеня за апошнія сем гадоў. Цана ж знізілася на 0,6 %. Наш экспрт Мікалай Прасталупаў лічыць, што ў ліпені назіралася плаўнае зніжэнне цэн (0,5—0,7 %), што прырэальных здзелках адпавядае патанненню кватэр на суму ад адной да трох тысяч долараў, у залежнасці ад класа аб'екта.

Як вядома, ва ўмовах крызісу ў пачатку вясны гэтага года вялікая колькасць здзелак з кватэрамі была пастаўлена на паўзу. Аднак са стабілізацыяй курсу валют у красавіку і ў наступныя месяцы людзі працягнулі вырашаць свае кватэрныя пытанні.

У выніку другі квартал года выдаўся паспяховым з пункту гледжання колькасці здзелак з кватэрамі ў параўнанні з мінулымі гадамі. У красавіку колькасць прададзеных кватэр была максімальнай для сярэдзіны вясны за апошнія 10 гадоў, у маі — максімум з 2016 года для гэтага месяца. Па папярэдніх даных, у чэрвені актыўнасць пакупнікоў выраслаяшчэ на 7 % — да 1385 здзелак. Гэта таксама новы максімум для чэрвеня за апошнія сем гадоў.

Попыт на маленькія кватэры «асеў»

Характэрна, што ў чэрвені, як і ў маі, у агульным попыце прыкметна скарацілася доля аднапакаёвых кватэр. Калі з канца 2020 года кожная другая прададзеная ў тым ці іншым месяцы кватэра была аднапакаёвай, то ў апошнія месяцы іх было ўжо толькі каля 40 % ад усіх здзелак. У той жа час сталі купляць больш двухпакаёвых кватэр (37 % супраць 30—34 % у папярэднія месяцы). Доля трохпакаёвых кватэр склала звычайныя 16 %.

Таксама істотна скарацілася доля здзелак з кватэрамі ў новых гатовых дамах. Яна трымалася у межах аднаксі ў 20 % апошнія 1,5 года, аднак у чэрвені 2022 года апусцілася да 10 %. Гэта адбылося за кошт істотнага скарачэння ў здзелках долі Кастрычніцкага раёна сталіцы, дзе практычна распрадаўся пласт гатовых сучасных каркасных дамоў. У наступныя гады, па меры завяршэння распачатых новабудоўляў у раёне, доля здзелак з новымі гатовымі кватэрамі зноў можа ўзрасці. Акрамя Кастрычніцкага раёна, у чэрвені ў агульным попыце знізілася ўдзельная вага Маскоўскага і Ленінскага раёнаў. Доля Фрунзенскага раёна, наадварот, узрасла.

Па тыпах дамоў скарацілася колькасць здзелак з кватэрамі ў сучасных «каркасніках». У той жа час долі здзелак з кватэрамі ў старых цагляных і сучасных панэльных дамах у чэрвені ўзраслі.

Шмат залежыць ад аб'ёму прапаноў, а не толькі ад попыту

За апошні месяц сярэдняя цана «квадратны метр» у прададзеных кватэрах у Мінску знізілася на 0,6 % і склала 1271 долар. У залежнасці ад колькасці пакояў сітуацыя была наступнай. У аднапакаёвых кватэрах за месяц квадратны метр жылля патаннеў на 0,4 % і склаў 1347 долараў, або 48 тысяч долараў у абсалютным вымярэнні. Квадратны метр двухпакаёвых кватэр стаў «лягчэйшым» на 1,3 % і роўным 1228 доларам, а ў абсалюце — 54,65 тысячы долараў. «Квадрат» трохпакаёвых кватэр каштаваў 1183 долары (72 250 долараў), а чатырохпакаёвых — 1148 долараў (84 830 долараў).

Улічваючы значна павялічаны попыт на жылле, узнікае пытанне: чаму цэны на кватэры зніжаюцца? На думку Мікалая Прасталупава, цяпер у Мінску назіраецца амаль максімальны аб'ём выстаўленых на продаж аб'ектаў. Прапанова кватэр у сталіцы за апошні тыдзень злёгку павялічылася — плюс 1 % у параўнанні з папярэднім панядзелкам, з 14,8 тысячы аб'ектаў да 14,9 тысячы кватэр. Прапанова кватэр у базе Realt за апошні месяц выраслана 2 %, гэта нягледзячы на тое, што ў чэрвені была прададзена рэкордная колькасць кватэр.

Зніжэнне спыніцца не «заўтра»?

З агульнай колькасці прадаўцоў на мінулым тыдні знізілі цэны на свае аб'екты 4 % з іх, а памер зніжкі складаў у сярэднім ад адной тысячы да трох тысяч долараў.

Улічваючы 15 тысяч выстаўленых на продаж кватэр, мы атрымліваем той факт, што ўладальнікі сталічнай нерухомасці знізілі цэны на 25 % кватэр. На першы погляд, паказчык здаецца значным, але летась 30—35 % прапаноў размяшчаліся са зніжанай цаной (пры меншай колькасці аб'яў). Гэта можа значыць дзве рэчы: па-першае, менш людзей зацікаўлена ў хуткім продажы сваёй нерухомасці, а па-другое, зніжаць цану далей — нявыгадна.

На думку нашага эксперта, новы актыўны сезон продажаў нерухомасці пачнецца з другой паловы жніўня і працягнецца да сярэдзіны кастрычніка. Як будуць паводзіць сябе на рынку патэнцыйныя пакупнікі, не ведае ніхто. Па вопыце мінулых гадоў, можна выказаць здагадку, што на рынак прыйдуць нябедныя бацькі іншагародніх студэнтаў, якія захочуць вырашыць кватэрнае пытанне сваім дзецям. Але гэтыя кліенты наўрад ці створаць асобную тэндэнцыю. Таму што ў гэты час студэнтам купляецца некалькі дзясяткаў кватэр, не больш.

Яшчэ адным фактарам, які мог бы змяніць цэны ў той ці іншы бок больш істотна, з'яўляюцца буйныя забудоўшчыкі. У іх сёння знаходзіцца каля 3 тысяч гатовых да продажу кватэр. Продажы рухаюцца трох цяжкасцю, але ўласнікі жылля не прапаноўваюць нейкіх досыць рэальных зніжак.

Дробныя арганізатары будаўніцтва ў апошні час былі выпхнутыя з рынку жорсткімі сацыяльнымі нарматывамі. Таму засталося толькі некалькі буйных забудоўшчыкаў, якія ўпэўнена адчуваюць сябе на рынку практычна без канкурэнцыі.

Як змяніліся кошты за паўгода

За паўгода сярэдняя цана за квадратны метр знізілася на 25 долараў. Згодна з базай, калі сярэдняя цана квадратнага метра аб'яў усіх тыпаў кватэр, якія былі апублікаваныя ў студзені, складала 1335 долараў, то ў чэрвені сярэдні паказчык склаў 1310 долараў за «квадрат».

Пры гэтым паміж студзенем і чэрвенем доларавыя цэны паспелі перажыць пік, падскочыўшы да 1346 долараў за квадратны метр у сакавіку. І гэта нягледзячы на рэзкі рост курсу валют, цяжкасці пры зняцці наяўных, адкат амаль усіх крэдытных праграм, якія толькі нядаўна запрацавалі. Цяпер сітуацыя з цэнамі кардынальным чынам змянілася.

Далёка не самыя дрэнныя кватэры ў Мінску прадаюць да 40 тысяч долараў, калі раней варыянты з такімі цэнамі можна было знайсці толькі ў Шабанах або ў дамах, якія пара бы зносіць, таму што наўрад ці знойдуцца грошы на іх поўную рэканструкцыю.

Цэны на новабудоўлі таксама змяніліся, але вельмі фрагментарна. Праекты, якія былі ўжо на стадыі ўзвядзення і апублікавалі кошты, сваёй лініі паводзін не мянялі: цэны падрасталі па меры ўзвядзення дамоў і павелічэння попыту. Напрыклад, у першым доме «Квартала на Грушаўцы», які здаюць сёлета, выраслі цэны прыкладна на 100 долараў разам з набліжэннем да тэрмінаў здачы.

Актыўнае набыццё нерухомасці ў крызіс

Калі параўноўваць статыстыку Нацыянальнага кадастравага агенцтва, то даныя па агульнай колькасці здзелак са студзеня да чэрвеня 2021 і 2022 гадоў практычна аднолькавыя: 7591 і 7834 адпаведна. І гэта нават больш, чым у дакрызісным 2019 годзе, тады за падобны перыяд у Мінску заключылі ўсяго 6973 здзелкі.

Сярэднямесячная колькасць здзелак у сталіцы вагаецца ад 1100 у пачатку года да 1300 бліжэй да сярэдзіны.

Па краіне за паўгода здзейснілі 24 тысячы здзелак, сітуацыя прыкладна тая ж, што і з Мінскам, колькасць здзелак павольна расце ад пачатку года да сярэдзіны, калі не лічыць сакавік. У студзені — 3450 здзелак, у маі — 4180, а ў чэрвені — 4236. З усіх набытых за паўгода кватэр 3644 былі аднапакаёвыя, 2427 — двухпакаёвыя, 1266 — трохпакаёвыя і толькі 297 — з большай колькасцю пакояў. Тут нічога не змянілася, такая структура дакладна адпавядае папярэднім сезонам. А вось попыт на прыватныя дамы ўпаў у параўнанні з тым жа перыядам 2021 года. Па краіне сёлета купілі 12488 дамоў, калі летась — 14075. Гэта значыць, цікавасць да загараднай нерухомасці знізілася на 11 %.

Што маем у актыве?

З вышэйсказанага наш эксперт зрабіў некалькі высноў. Па-першае, рынак продажу кватэр перажыў паніку і вярнуўся ў каляіну стабільнага і вельмі павольнага зніжэння цэн. Стабільнага, таму што пакупніцкая здольнасць пакуль невысокая, а павольнага, таму што многія варыянты ўжо прадаюцца на ўзроўні або ніжэй той цаны, за якую кватэру куплялі першапачаткова (у доларах). А колькасць прапаноў застаецца стабільна высокай.

Пры гэтым кватэры купляюцца гэтак жа, як і летась. Колькасць здзелак і структура пакупак практычна не змяніліся.

На рынку арэнды, пры ўсё яшчэ велізарнай прапанове кватэр, няма ніякага стымулу і магчымасці для вяртання да папярэдніх цэн.

❍ У тэму

СПАДАРОЖНЫЯ ВЫДАТКІ Ў БУДАЎНІЦТВЕ БУДУЦЬ ЗНІЖАЦЦА

У пачатку 2022 года цана метра з дзяржпадтрымкай, па даных Міністэрства будаўніцтва і архітэктуры, склала 1176 рублёў. Міністр гэтага ведамства Руслан Пархамовіч распавёў, як збіраюцца знізіць цану на жылле.

— У будаўніцтве жылля ёсць і спадарожныя выдаткі: праектаванне, работы па жаданні заказчыка, тэхнічны нагляд. Сёння асноўная ўвага аддадзена якраз гэтым спадарожным выдаткам. Мы іх вельмі старанна аналізуем. Думаю, што за кошт гэтага і будзем імкнуцца да яшчэ большага скарачэння кошту будаўніцтва жылля з дзяржпадтрымкай, — распавёў **міністр архітэктуры і будаўніцтва Руслан ПАРХАМОВІЧ.**

Паводле яго слоў, цана на жылле будзе скарэктавана прыкладна на 3-5 % у бок патаннення. Руслан Пархамовіч адзначыў, што гэта таксама будзе распаўсюджвацца на кошт камерцыйнага жылля. «Заказчыкі дзейнічаюць па адных правілах і пры будаўніцтве жылля з дзяржпадтрымкай, і на камерцыйным жыллі».

Добрая навіна

КРЭДЫТЫ СТАНОВЯЦЦА БОЛЬШ ДАСТУПНЫМІ

Літаральна з першых дзён жніўня Беларусбанк знізае працэнтныя стаўкі па некаторых крэдытах, звязаных з будаўніцтвам жылля.

Згаданым фінансавым інстытутам з 1 жніўня зніжаюцца працэнтныя стаўкі да 17,5 % гадавых па зноў заключаных крэдытных дагаворах для дакрэдытавання грамадзян, якія да гэтага заключылі ў банку такія дагаворы на фінансаванне нерухомасці з дзяржпадтрымкай.

Акрамя таго, цяпер стаўкі для грамадзян, якія заключылі дагаворы на будаўніцтва жылля (без падтрымкі дзяржавы) з дзяржаўнымі заказчыкамі (забудоўшчыкамі), знізілі і складуць 19,5 % гадавых. Таксама банк зноў пачынае выдаваць крэдыты на будаўніцтва (рэканструкцыю) жылых памяшканняў у розных забудоўшчыкаў незалежна ад формы ўласнасці пад 21,5 % гадавых.

Як і раней, можна скарыстацца партнёрскай праграмай «Іпатэка з намі» з партнёрамі-дзяржзабудоўшчыкамі, у тым ліку і з новымі — ДВА «Мінскбуд» і ААТ «Магілёўскі домабудаўнічы камбінат». Пры гэтым стаўка па дадзеным крэдытным прадукце ў грэйс-перыяд складзе ад 10,5 % гадавых. Гадавая стаўка па крэдыце «Іпатэка экспрэс» на куплю нерухомасці цяпер складае 21,5 %.

Як адзначыла прэс-служба Беларусбанка, змены закрануць і пакупнікоў аўтамабіляў Geely. Стаўка па крэдыце па заканчэнні грэйс-перыяду зніжана да 19,75 % гадавых (стаўка рэфінансавання плюс 7,75 %). На працягу грэйс-перыяду стаўка па крэдыце складзе 8,0 % гадавых (стаўка рэфінансавання мінус 4 %).

Да 19,75 % гадавых апусціліся працэнтныя стаўкі па новых авердрафтных крэдытах з тэрмінам прадастаўлення і пагашэння — адзін год.

Матэрыялы падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ.

Медыяпрастора

«ГАЗЕТА — ГЭТА ЦЭЛЬНЫ, ПРАГРАМНЫ ПАРАДАК ДНЯ»

Сёння газета «СБ. Беларусь сегодня» адзначае 95-гадовы юбілей. Пра тое, чым жыве адно з найстарэйшых выданняў краіны, пра тэндэнцыі і выпрабаванні, пра журналістаў і чытачоў гутарым з дырэктарам — галоўным рэдактарам Выдавецкага дома «Беларусь сегодня» Дзмітрыем ЖУКОМ.

Фота Бел ТА.

— Дзмітрый Аляксандравіч, з мінулага юбілею — за нейкія пяць гадоў — шмат што змянілася і ў краіне, і ў вашай рэдакцыі. Выдавецкі дом «Беларусь сегодня» спраўдзіўся як буйны медыяхолдынг — некалькі газет, папулярны партал, сваё радыё і тэлебачанне. Якое месца ў ім займае найстарэйшая газета, што і дала імя ўсяму аб'яднанню? Выданне «СБ. Беларусь сегодня» — лакаматыў холдынга ці больш яго «таварны знак»?

— Лакаматывам і газеты, і ўсяго выдавецкага дома з'яўляюцца людзі, якія ў нас працуюць, і, безумоўна, у першую чаргу тыя, хто працуе ў газеце. Спачатку было слова — і гэту ісціну ніхто не адмяняў. Проста сёння з'явілася шмат магчымасцяў распаўсюджваць тое слова разнастайнымі шляхамі, не толькі праз газету. Я думаю, што такія магчымасці сёння нявычарпаныя, заўтра мы можам даведацца пра нейкія новыя спосабы і сродкі данясення інфармацыі. Але газета ўсё роўна застаецца флагманам. У 2013/2014 годзе адбылося аб'яднанне некалькі рэспубліканскіх газет у Выдавецкі дом « Беларусь сегодня». У адным праекце пад дадзенай назвай аб'ядналіся і таленты журналістаў, іх магчымасці, іх погляды на жыццё. Але газета засталася газетай, у яе ёсць свае чытачы і свая гісторыя. Да таго ж мы ставім перад сабой задачу, каб іншыя выданні, якія выходзяць у холдынгу, — «Рэспубліка», «Сельская газета», «Народная газета», «Знамя юности» — не былі падобныя на «СБ», каб яны мелі свой твар, свайго чытача.

Так гістарычна склалася, што «СБ. Беларусь сегодня» («Советская Белоруссия») доўгі час была і застаецца цэнтральнай газетай нашай краіны. І калектыў рэдакцыі накіраваны на тое, каб паказваць галоўнае, асноўнае ў жыцці Беларусі. Безумоўна, усё, што варта паказаць, немагчыма змясціць на шаснаццаці старонках газеты, нават калі яна выходзіць пяць разоў на тыдзень. Вось тады і падключаюцца ўжо згаданыя магчымасці перадачы інфармацыі — партал (у нас на ім 200 тысяч наведвальнікаў у суткі), радыё, тэлебачанне. Але ўсё-ткі газета — цэльны, праграмны парадак дня, які ўключае ў сабе ўсё важнае, што робіцца ў краіне на дадзены момант. Найперш Прэзідэнтам, бо менавіта ад яго рашэнняў залежаць без перабольшання ўсе сферы нашага жыцця... Сёння вялікую колькасць газетных палос мы аддаём і пад тэматыку гістарычнай памяці: расказваем чытачам і пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны, і пра вядомых суайчыннікаў, чыя дзейнасць паўплывала на станаўленне нашай дзяржаўнасці.

— За 95 гадоў існавання газеты ў розных пакаленняў яе журналістаў былі розныя часы, розныя выпрабаванні. Але, здаецца, для сённяшніх супрацоўнікаў часы ці не самыя складаныя за гісторыю...

— Тут я з вамі катэгарычна не пагаджуся. Самыя складаныя, найцяжэйшыя часы і для краіны, і для народа, і для журналістаў — і «Советской Белоруссии», і «звяздоўцаў» — была Вялікая Айчынная вайна. І дай бог, каб нам не давялося прайсці праз тое, што прайшлі тады нашы калегі-папярэднікі.

— Але ж і сёння ідзе вайна — інфармацыйная...

— Безумоўна, сёння ўсе, хто працуе ў сродках масавай інфармацыі, так ці інакш аказаліся на перадавой гібрыднай вайны, развязанай супраць нашай краіны. Гэта адбылося не ўчора і не пазаўчора — вайна супраць нас вялася паўтара дзесяцігоддзя дакладна. Проста апошнія два гады яна набыла вельмі інтэнсіўны характар... Сапраўды, гэтыя гады былі няпростыя для журналістаў. У калектыве прайшла свайго роду рэвізія кадраў: хтосьці вытрымаў прэсінг і хайп, а хтосьці — не. Таму засталіся, я думаю, больш моцныя ў сваіх перакананнях людзі, і гэта вельмі добра. Бо сёння мы працуем у калектыве ва ўнісон, на адной хвалі. Апошнія два гады былі выпрабаваннем, але яны далі такія цікавыя, яркія імёны, як Андрэй Мукавозчык, Людміла Гладкая, Раман Рудзь, Дзмітрый Крат, Максім Осіпаў... І гэты пералік імён будзе павялічвацца... На базе нашага выдавецкага дома з'явілася вельмі цікавая канглямерацыя радыё, сайта і газеты — маю на ўвазе радыёпраграму «Будни», якая выходзіць і на YouTube-канале, разбіваецца на інфармацыйныя кавалкі для сайта, і самае цікавае чытачы атрымліваюць у газеце... Вось такім шляхам ідзе сёння наш выдавецкі дом. Што нас чакае наперадзе? Я вам так скажу: мы павінны быць гатовыя да любога развіцця падзей і маладых журналістаў вучыць не толькі прафесіі, але і выхоўваць у іх маральна-этычныя якасці, вельмі важныя ў гэтай гібрыднай вайне.

— А як вы ставіцеся да таго, што ў гэтай вайне нашы палітычныя апаненты нярэдка спасылаюцца — у выгадным для сябе ключы — на матэрыялы «СБ. Беларусь сегодня»?

З ЮБІЛЕЕМ КАЛЕКТЫЎ «СБ. БЕЛАРУСЬ СЕГОДНЯ» ПАВІНШАВАЎ КІРАЎНІК ДЗЯРЖАВЫ

«Працягваючы традыцыі аднаго з найстарэйшых друкаваных выданняў, ваш калектыў заўсёды знаходзіцца ў цэнтры самых важных падзей, штодзённа расказвае аб галоўных навінах палітычнага, эканамічнага, культурнага і духоўнага жыцця беларусаў», — гаворыцца ў віншаванні.

Прэзідэнт выказаў упэўненасць, што, знаходзячыся на інфармацыйнай перадавой і адказваючы на сучасныя выклікі і пагрозы, супрацоўнікі газеты і надалей будуць адстойваць праўду, супрацьдзейнічаць фэйкам і хлусні, сумленна выконваць журналісцкі абавязак.

— Гэта вельмі добра! Значыць, мы цікавыя, нас чытаюць нават нашы апаненты. Калі яны на нас спасылаюцца, а асабліва калі нас крытыкуюць ці спрабуюць пераправіць на свой капыл — гэта сведчыць аб тым, што мы выконваем сваю работу прынамсі нядрэнна.

— Думаю, што апаненты ўжо заўважылі чацвярговы спецвыпуск «СБ. Беларусь сегодня» «Тенденции» — з сур'ёзнай палітычнай, эканамічнай аналітыкай. Гэта прэтэнзія на асобнае выданне ці ўсё ж неад'емная частка старой добрай «Советской»?

— Гэта не прэтэнзія — гэта спраўджанае асобнае выданне, якое стала вядомым у краіне. Але гэта неад'емная частка газеты. Чаму мы так зрабілі? Найперш было даручэнне кіраўніка дзяржавы — зрабіць нестандартны, цікавы, з замахам на аналітычнасць, з сучасным адмысловым афармленнем выпуск газеты. Паспрабавалі — нешта атрымліваецца, нешта пакуль не вельмі. Але гэта выпуск, які цалкам адпавядае сваёй назве — у ім сапраўды расказваецца пра тэндэнцыі, што склаліся ў краіне і ў свеце на сённяшні дзень.

— А як вы як галоўны рэдактар ставіцеся да таго, што вашы вядучыя журналісты, якія, па сутнасці, твар выдання, даволі часта са сваімі матэрыяламі з'яўляюцца ў іншых СМІ, на тэлебачанні, напрыклад?

— Я вам больш скажу: я сам іх да гэтага падштурхоўваю і заахвочваю. Бо і ў газеце, і там яны працуюць на карысць нашай краіны.

— Мне здаецца, гэта таксама тэндэнцыя нашага часу. Бо яшчэ гадоў дваццаць таму кіраўнікі СМІ вельмі раўніва ставіліся да таго, калі журналіст (а тым больш вядучы журналіст) працаваў недзе яшчэ...

— Раней у рэдактараў было лакальнае разуменне свайго калектыву і таго выніку, які калектыў павінен даць сваёй працай. Безумоўна, была канкурэнцыя, ішло нават своеасаблівае змаганне за таленавітых журналістаў. Сёння сітуацыя іншая. Мы ўсе разам — дзяржаўныя СМІ — працуем на краіну адзіным фронтам. Калі нашы журналісты з'яўляюцца ў тэлеэфіры — яны таксама працуюць на краіну. А яшчэ, заўважу, рэкламуюць наш выдавецкі дом і газету — не без таго... Дарэчы, трэба сказаць, што тут гульня ў двое варот — некаторыя тэлежурналісты з ахвотай і таленавіта пішуць артыкулы ў газеты.

— Але чытач сёння чакае не толькі таленавітых журналістаў, але і якасную аналітыку ад экспертаў. А якраз экспертная супольнасць у нас даволі вузкая...

— Вы маеце на ўвазе, што аналітыкамі выступаюць адны і тыя ж людзі? Калі гэта і праблема — дык хутчэй для нашых калег з тэлебачання. Што датычыцца газеты — калі табе не хапае экспертаў ці надакучылі адны і тыя — бяры і пішы сам. Я перакананы: журналісты, якія сур'ёзна займаюцца пэўнай праблематыкай шмат гадоў, не горш за тых дыпламаваных экспертаў разбіраюцца ў тэме. І ў нас такія журналісты ёсць.

— Увогуле, як вы мяркуеце, за апошнія два гады чытач «СБ. Беларусь сегодня» змяніўся?

— Чытач не змяніўся, змянілася, скажам так, кола яго зацікаўленасці. Калі дзесяць гадоў таму ён пісаў у газету пра павалены плот ці нявывезенае смецце, сёння ў допісах у рэдакцыю ён разважае на больш сур'ёзныя, глабальныя тэмы. Яго хвалююць пытанні захавання нашага суверэнітэту, як будзе працаваць наша эканоміка... Ён ужо ўзвысіўся над пытаннямі, якія датычыліся яго ўласнага жыцця і быту. Ведаеце, чаму гэта адбылося? Многія бытавыя пытанні людзей вырашыліся дзякуючы сацыяльна-эканамічнаму развіццю краіны. Вядома, яны заўсёды будуць узнікаць. І суседзі будуць сварыцца пры любым раскладзе. Але сёння большасць людзей прыярытэты расстаўляе па-іншаму, на больш высокім узроўні. Сітуацыя ў свеце да гэтага падштурхоўвае.

— Як будзеце адзначаць юбілей?

— На рабоце (*смяецца*). А калі сур'ёзна — мы яго ўжо адзначылі экскурсіяй у Палац Незалежнасці, якую зладзілі днямі для нашага калектыву. Было надзвычай цікава. Я хацеў, каб туды трапілі не толькі журналісты, але і тыя, хто літаральна робіць газету, — вярстальшчыкі, карэктары... Мне здаецца, гэта быў добры падарунак да юбілею — людзі, якія пішуць пра падзеі, што адбываюцца ў палацы, якія вычытваюць і ставяць гэтыя матэрыялы, змаглі на свае вочы ўбачыць усё зблізку, знутры... Будуць, вядома, нейкія ўзнагароды, віншаванні. А так святкаваць няма калі — працаваць трэба.

— Калі параўноўваць 95-гадовую газету з жанчынай — якая яна? Мудрая і іранічная, вечна маладая, бабуля, якая дасць фору дзяўчыне?...

— Гэта вельмі няўдзячная справа — мераць штосьці чалавечымі якасцямі... Я думаю, сёння «СБ. Беларусь сегодня» — гэта сталая сям'я, у якой ёсць дарослыя, якія цягнуць на сабе асноўную работу, ёсць старэйшыя, якія падказваюць, раяць, грунтуючыся на сваім вопыце, і ёсць маладыя, якія вучацца і ў дарослых, і ў старэйшых...

— Калі гэта так, то ў такой сям'і добрая будучыня...

— Будзем спадзявацца.

Гутарыла Алена ЛЯЎКОВІЧ.

Прыёмная кампанія — 2022

Абітурыенцкі максімум у БДМУ — 397 балаў

Вынікі залічэння на першы курс на бюджэтную форму навучання падвялі ў Беларускім дзяржаўным медыцынскім універсітэце. Як расказалі ў прэс-службе ВНУ, сёлета быў павялічаны набор студэнтаў на першы курс: калі ў 2021 годзе на бюджэтнай аснове ён складаў 660 чалавек, то ў 2022 годзе — 720. Па-другое, выраслі лічбы мэтавага набору — да 50 працэнтаў ад лічбы набору на бюджэт. А лідарамі рэйтынгу папулярнасці сярод абітурыентаў гэтага года сталі стаматалагічны, фармацэўтычны і лячэбны факультэты.

Трэба адзначыць, што з 18 ліпеня (а гэты дзень быў першым з сямі, адведзеных для падачы дакументаў на бюджэтную форму навучання) прыёмная камісія БДМУ працавала з раніцы і да позняга вечара, бо колькасць кандыдатаў у студэнты вядучага медыцынскага ўніверсітэта краіны аказалася немалой — звыш 1,1 тысячы чалавек.

Першынство па прахадных балах на бюджэнай форме навучання — у стаматалагічнага факультэта: стаць яго студэнтам магчыма было, толькі набраўшы 369 балаў. Пры гэтым максімальны бал, які маюць у абітурыенцкім багажы маладыя людзі, што пажадалі стаць урачамі-стаматолагамі, дасягае 394.

Да таго ж і мэтавікі стаматалагічнага факультэта ўзялі высокую планку: у залежнасці ад рэгіёна, які даваў мэтавае накіраванне, іх прахадныя балы вар'іраваліся ад 341 да 349.

Каб стаць студэнтам фармацэўтычнага факультэта, трэба было набрасць 364 балы. Дарэчы, сярод будучых правізараў ёсць тыя, хто меў у сваім багажы больш за 390 балаў. А мэтавікі паказалі прахадныя балы ад 328 да 363.

Права асвойваць прафесію «лячэбніка» заслужылі юнакі і дзяўчаты з сумарнымі баламі 358 і больш (гэта балы трох ЦТ і сярэдняга бала атэстата). Абітурыенцкі ж максімум бягучага года сярод іх склаў 397 балаў. Прычым тры першакурснікі на лячэбным факультэце набралі больш за 390 балаў. Сярод абітурыентаў, якія паступілі на мэтавым конкурсе, прахадныя балы з улікам рэгіёна былі ад 281 да 304.

На педыятрычны факультэт прахадны бал па агульным конкурсе спыніўся на адзнацы 327, а на медыка-прафілактычны факультэт — 284.

Трэба дадаць, што прыёмная камісія Белдзяржмедуніверсітэта працягвае прыём дакументаў ад абітурыентаў, якія пажадаюць вучыцца на платнай аснове і на падрыхтоўчым аддзяленні. Апошні дзень прыёму дакументаў на пазабюджэт — 8 жніўня, на падрыхтоўчае аддзяленне — да 11 жніўня ўключна.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Наўздагон

ВЕСЕЛА І ВІДОВІШЧНА

Брэст адсвяткаваў Дзень горада

Здаецца, зусім нядаўна мы ўрачыста і відовішчна адзначалі тысячагадовы юбілей горада, а ўжо 1003-і дзень нараджэння пагрукаўся ў дзверы. Варта сказаць, што кожны год у праграму святкавання дадаецца порцыя навацый. Сёлета, напрыклад, такой разыначкай стаў фестываль моды і стылю «LookБуг». Былі і іншыя крэатыўныя цікавосткі.

Як заўсёды, пачаткам святкаванняў стала ўшаноўванне памяці вызваліцеляў Брэста. Менавіта да дня вызвалення — 28 ліпеня — прымеркаваны Дзень горада. Дата асаблівая: у гэты дзень з вызваленнем Брэста канчаткова свабоднай стала ўся тэрыторыя сучаснай Беларусі. Значыць, ёсць нагода для асаблівай пашаны воінаў-вызваліцеляў, якая і была аддадзена вянкамі, кветкамі каля памятных месцаў.

Афіцыйнае адкрыццё прайшло на Савецкай каля помніка Тысячагоддзя Брэста. Сюды прыйшлі не толькі сотні гараджан, але і шматлікія госці. Напрыклад, члены дэлегацый гарадоў-пабраціма Самары, Каўрова, Разані, Астрахані, Калінінграда, Петразаводска, С.-Пецярбурга і іншых. Былі госці і з Германіі, Латвіі, Славакіі, Польшчы.

Урачыстасць аб'явіў адкрытай **старшыня гарвыканкама Аляксандр РАГАЧУК** і пажадаў усім вясёлых, запамінальных святкаванняў. Настрой падхапіў улюбёнец гараджан — Брэсцкі духавы аркестр. Тут жа, на Савецкай, людзі актыўна падтрымалі артыстаў спевамі, танцамі. Такім чынам, Дзень горада загучаў разнастайнымі мелодыямі і галасамі.

Тым часам на пляцоўцы побач з Лядовым палацам збіраліся гараджане. Ішлі з сябрамі, сем'ямі. Тут чакалі анансаваны арганізатарамі канцэрт расійскага гурта «DaBro». Але пакуль музыканты, як і большасць гасцей, знаёміліся з горадам, наведвалі Брэсцкую крэпасць, удзельнікі свята не сумавалі. Дыджэі «Радыё Брэст» змаглі добра-такі завесці-развесяліць публіку. Было шмат конкурсаў, забаўлянак, міні-дыскатэк. Выступалі беларускія артысты.

Музыканты спявалі, шмат рухаліся па сцэне пад шчодрую падтрымку гледачоў. Давялося пачуць дзве зусім палярныя ацэнкі прыезджых артыстаў. Маладзёжная кампанія дзялілася ўзнёслымі водгукамі, а вось сямейная пара сярэдніх гадоў агучыла і маё ўражанне, што многія брэсцкія артысты выступілі б зусім не горш. У любым выпадку было прыемна, калі музыканты пад заслону канцэрта пажадалі брастаўчанам любіць і шанаваць свой чысты і прыгожы горад.

Канцэрт, як ужо было сказана, не абмяжоўваўся выступленнем гурта «DaBro» — многім вельмі спадабалася выступленне Мухтара Хардаева з Кабардзіна-Балкарыі, лаўрэата прэміі «Шансон года».

Дарэчы, на гэтай жа пляцоўцы за некалькі гадзін да канцэрта прайшла знакавая падзея — першы фестываль моды і стылю «LookБуг-2022». Першы (таму што адкрыты адлік), фэст дамовіліся зрабіць традыцыйным.

Са сцэны паказалі сорак калекцый адзення 38 прадпрыемстваў, з іх — 28 брэсцкіх. Сем калекцый прывёз канцэрн «Беллегпрам». Прафесійныя мадэлі дэманстравалі аўтэнтычныя льняныя калекцыі, смелыя варыяцыі дзелавога касцюма, цікавы варыянт школьнай формы. Наогул, было шмат прыгажосці як на сцэне, так і ў гандлёвых павільёнах, што разгарнуліся побач. Многія ўзоры вырабаў фірмы-вытворцы прапаноўвалі на продаж. Купіць абноўку на гэтым паказе моды было цалкам магчыма. А кіраўнік канцэрна «Беллегпрам» Таццяна Лугіна сказала, што фестываль будзе працягвацца, развівацца, напаўняцца новым зместам. Так што па моду кожнае лета можна будзе смела накіроўвацца ў Брэст.

Варта сказаць, што вельмі цікавымі атрымаліся паказальныя выступленні ратавальнікаў з падраздзяленняў МНС. Яны паказалі сваё майстэрства на зямлі, на вадзе і ў паветры. Асабліва задаволенымі гэтай часткай праграмы аказаліся юныя гледачы. Як і абяцалі арганізатары, апафеозам свята стаў шыкоўны феерверк.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Побач працаваў дзіцячы гарадок. Мноства імправізаваных кафэ прапаноўвалі самую розную смакату. Гандлёвыя пункты прывезлі процьму сувенірнай прадукцыі. А самым, бадай, эфектным момантам гэтай часткі праграмы было віртуознае прызямленне парашутыстаў. Справа ў тым, што над пляцоўкай, дзе тусілі тысячы людзей, кружыў самалёт, які перыядычна пакідалі адважныя парашутысты, што прызямляліся на пляцоўку, дзе, здавалася, нават метра вольнага не было. Майстры парашутнага спорту кружыліся, рабілі віражы менавіта ў пошуку. Як толькі месца заўважалася, парашутыст рабіў імклівы манеўр і прызямляўся пад шчырыя апладысменты публікі. Гэта было па-сапраўднаму захапляльна. Гледачы сталі сведкамі высокага майстэрства тых, каго адзін мой калега не без падстаў назваў нябеснымі коннікамі.

Канцэрт братоў Івана і Міхаіла Засідкевічаў, удзельнікаў гурта «DaBro» разагрэтая публіка ўспрыняла «на ўра».

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Косаве да 1 верасня адклалі ўвядзенне забароны на сербскія дакументы і аўтанумары

Улады непрызнанага Косава прынялі рашэнне адкласці да 1 верасня ўвядзенне забароны ў рэгіёне на сербскія дакументы і аўтамабільныя нумары. Такая адтэрміноўка адобрана на фоне эскалацыі сітуацыі ў рэгіёне і націску міжнароднай грамадскасці, паведаміла ТАСС. Косаўскія ўлады напрыканцы чэрвеня прынялі ўказ, паводле якога на тэрыторыі рэгіёна з 1 жніўня забаранялася выкарыстанне сербскіх аўтамабільных нумароў і дакументаў. 31 ліпеня абстаноўка ў Косаве абвастрылася. Мясцовая паліцыя закрыла два КПП у цэнтральную частку Сербіі. У выніку сербы, якія пражываюць на поўначы Косава, выйшлі на акцыі пратэсту. Людзі пачалі ўзводзіць на дарогах барыкады, адбыліся перастрэлкі. Першымі дзеянні косаўскіх улад раскрытыкавалі ў Маскве. Расійскае МЗС заклікала ўлады Косава, а таксама ЗША і ЕС, якія за ім стаяць, спыніць правакацыйныя дзеянні і паважаць правы сербаў. У ноч на 1 жніўня Міжнародная місія пад эгідай Паўночнаатлантычнага альянсу ў самаабвешчаным Косаве (KFOR) прыгразіла ўмяшацца ў канфлікт, калі ўзнікнуць пагрозы стабільнасці ў рэгіёне. Да захавання спакою і аднаўлення свабоды перамяшчэння таксама заклікала Місія ААН па справах часовай адміністрацыі ў Косаве. Адзначаецца, што рашэнне косаўскіх улад адтэрміноваць да верасня забарону на сербскія дакументы не вырашае праблему. Не выключана, што ў канцы жніўня канфлікт у рэгіёне ўспыхне з новай сілай.

Прэзідэнт Балгарыі распусціў парламент і прызначыў датэрміновыя выбары на 2 кастрычніка

Балгарскі лідар Румэн Радзеў на фоне ўрадавага крызісу ў краіне падпісаў указ аб роспуску парламента і прызначыў датэрміновыя выбары на 2 кастрычніка, паведаміла РІА «Навіны». Згодна з указам, цяперашні парламент спыніць сваю работу 2 жніўня. Роўна праз два месяцы пройдуць новыя парламенцкія выбары. Радзеў таксама падпісаў указ аб прызначэнні тэхнічнага ўрада, які ўзначаліць былы міністр працы Гылыб Донеў. У чэрвені ўрад краіны на чале з прэм'ерам Кірылам Петкавым атрымаў вотум недаверу і быў вымушаны пайсці ў адстаўку. Гэта адбылося на фоне незадаволенасці апазіцыі эканамічнай палітыкай урада і імклівым ростам інфляцыі ў Балгарыі.

З-за анамальнай спякоты ў Іспаніі ў ліпені памерла больш чым 2 тысячы чалавек

Аб гэтым сведчаць даныя Інстытута здароўя Карласа III. У мінулым годзе за такі ж перыяд, паводле звестак сістэмы маніторынгу штодзённай смяротнасці інстытута, смерцяў ад высокіх тэмператур было прыкладна ў чатыры разы менш. З агульнай колькасці смерцяў больш як 1,3 тысячы чалавек былі старэйшыя за 85 гадоў, яшчэ 470 — ад 75 да 84 гадоў. Амаль 180 памерлых ад спякоты былі ва ўзросце ад 65 да 74 гадоў, звыш 80 — ад 45 да 64 гадоў. Акрамя гэтага, анамальная спякота стала прычынай смерці дзесяці дзяцей ва ўзросце да 14 гадоў. Больш за ўсё людзей загінула 18 і 19 ліпеня — 184 чалавекі. У гэты час сярэдняя тэмпература па краіне вагалася ў раёне 38—40 градусаў.

Отчет эмитента ценных бумаг за 2-й квартал 2022 года

ООО «Темпл Сити»

220012, г. Минск, пр-т Независимости, 95/1, комн. 7, УНП 192280260
Вид экономической деятельности: сдача внаем собственного и арендуемого имущества
Единица измерения: тыс. руб.

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 30 июня 2022 года

АКТИВЫ	Код строки	На 30 июня 2022 года	На 31 декабря 2021 года
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	7 167	7 245
Нематериальные активы	120	1	1
Доходные вложения в материальные активы	130	-	-
в том числе:			
инвестиционная недвижимость	131	-	-
предметы финансовой аренды (лизинга)	132	-	-
прочие доходные вложения в материальные активы	133	-	-
Вложения в долгосрочные активы	140	-	-
Долгосрочные финансовые вложения	150	14	14
Отложенные налоговые активы	160	-	-
Долгосрочная дебиторская задолженность	170	-	-
Прочие долгосрочные активы	180	9	10
ИТОГО по разделу I	**190**	**7 191**	**7 270**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	14	14
в том числе:			
материалы	211	14	14
животные на выращивании и откорме	212	-	-
незавершенное производство	213	-	-
готовая продукция и товары	214	-	-
товары отгруженные	215	-	-
прочие запасы	216	-	-
Долгосрочные активы, предназначенные для реализации	220	-	-
Расходы будущих периодов	230	-	-
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	-	-
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	129	170
Краткосрочные финансовые вложения	260	19	54
Денежные средства и эквиваленты денежных средств	270	4	85
Прочие краткосрочные активы	280	-	-
ИТОГО по разделу II	**290**	**166**	**323**
БАЛАНС	**300**	**7 357**	**7 593**

СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА	Код строки	На 30 июня 2022 года	На 31 декабря 2021 года
1	2	3	4
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	1 874	1 874
Неоплаченная часть уставного капитала	420	-	-
Собственные акции (доли в уставном капитале)	430	-	-
Резервный капитал	440	-	-
Добавочный капитал	450	-	-
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	(136)	(136)
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	470	108	-
Целевое финансирование	480	-	-
ИТОГО по разделу III	**490**	**1 846**	**1 738**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	4 136	4 800
Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам	520	-	-
Отложенные налоговые обязательства	530	-	-
Доходы будущих периодов	540	-	-
Резервы предстоящих платежей	550	-	-
Прочие долгосрочные обязательства	560	334	334
ИТОГО по разделу IV	**590**	**4 470**	**5 134**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	16	-
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620	559	632
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	77	89
в том числе:			
поставщикам, подрядчикам, исполнителям	631	12	14
по авансам полученным	632	5	5
по налогам и сборам	633	14	23
по социальному страхованию и обеспечению	634	1	1
по оплате труда	635	1	2
по лизинговым платежам	636	-	-
собственнику имущества (учредителям, участникам)	637	-	-
прочим кредиторам	638	44	44
Обязательства, предназначенные для реализации	640	-	-
Доходы будущих периодов	650	389	-
Резервы предстоящих платежей	660	-	-
Прочие краткосрочные обязательства	670	-	-
ИТОГО по разделу V	**690**	**1 041**	**721**
БАЛАНС	**700**	**7 357**	**7 593**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь – июнь 2022 года

Наименование показателей	Код строки	На 30 июня 2022 года	На 31 декабря 2021 года
1	2	3	4
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	516	610
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	-	-
Валовая прибыль	030	516	610
Управленческие расходы	040	(233)	(251)
Расходы на реализацию	050	-	-
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг	060	283	359
Прочие доходы по текущей деятельности	070	264	428
Прочие расходы по текущей деятельности	080	(278)	(429)
Прибыль (убыток) от текущей деятельности	090	269	358
Доходы по инвестиционной деятельности	100	1	2
В том числе:			
доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	101	-	-
доходы от участия в уставном капитале других организаций	102	-	-
проценты к получению	103	1	2
прочие доходы по инвестиционной деятельности	104	-	-
Расходы по инвестиционной деятельности	110	-	-
в том числе:			
расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	111	-	-
прочие расходы по инвестиционной деятельности	112	-	-
Доходы по финансовой деятельности	120	889	102
в том числе:			
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	121	889	102

Наименование показателей	Код строки	На 30 июня 2022 года	На 31 декабря 2021 года
1	2	3	4
прочие доходы по финансовой деятельности	122	-	-
Расходы по финансовой деятельности	130	(1051)	(292)
в том числе:			
проценты к уплате	131	(156)	(186)
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	132	(892)	(104)
прочие расходы по финансовой деятельности	133	(3)	(2)
Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности	140	(161)	(188)
Прибыль (убыток) до налогообложения	150	108	170
Налог на прибыль	160	-	-
Изменение отложенных налоговых активов	170	-	-
Изменение отложенных налоговых обязательств	180	-	-
Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода)	190	-	-
Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода)	200	-	-
Чистая прибыль (убыток)	210	108	170
Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	220	-	-
Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	230	-	-
Совокупная прибыль (убыток)	240	108	170
Базовая прибыль (убыток) на акцию	250	-	-
Разводненная прибыль (убыток) на акцию	260	-	-

ООО «СпецРеализация» объявляет о проведении третьих повторных открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ООО «Практическая Механика»

(УНП 192071634, г. Минск, ул. Чапаева, д. 3, каб. 322),
находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства)

***Дата и время проведения торгов*: 17 августа 2022 года.**
Начало – 10.00. Заявки принимаются с 02 августа 2022 года по 15 августа 2022 года.

Место проведения торгов: г. Минск, просп. Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».

Организатор торгов: ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41), тел. 8 (029) 684-71-76.

Продавец: **ООО «Практическая Механика» (УНП 192071634)** в лице антикризисного управляющего – индивидуального предпринимателя Воронец Анастасии Анатольевны, тел. 8 (029) 570-39-28.

Шаг торгов – 5 %. Задаток – 10 %.

Подробная информация об имуществе, условиях торгов и порядке проведения размещена на интернет-сайте http://bankrot.gov.by/» и http://www.specrealization.by/.

Контактный телефон для осмотра лота в рабочее время (с 9.00 до 17.00) +375296847176.

Сведения о предыдущих торгах:

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 60 (29682) за 29.03.2022.

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 99 (29721) за 24.05.2022.

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 119 (29741) за 21.06.2022.

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5**
Продавец	**ОАО «МИЛКАВИТА», г. Гомель, ул. Бр. Лизюковых, 1**
Оператор ЭТП	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46**
Адрес ЭТП	**www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов

№ лота	Наименование	Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб.
1	**Полуприцеп специальный фургон-рефрижератор KUPAVA 9300W0** A 3222A-3, рама Y3H9300W080040922	**27 480,00**
2	**Полуприцеп специальный фургон изотермический MAZ 97585 KUPAVA 930011** A2653A-3, рама Y3H93001160040007	**6 120,00**
3	**Полуприцеп специальный фургон изотермический MAZ 837810 KUPAVA 871100** A3237A-3, рама Y3H87110090050280	**38 760,00**
4	**Полуприцеп специальный фургон изотермический MAZ 837810 KUPAVA 871100** A3520A-3, рама Y3H87110090050281	**38 760,00**

Месторасположение **– г. Гомель, ул. Бр. Лизюковых, 1**

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» по адресу: г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после электронных торгов. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Условия оплаты предмета аукциона: предмет аукциона должен быть оплачен покупателем в течение **12 (двенадцати)** рабочих дней со дня проведения аукциона

Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **7 %** от цены продажи лота в течение 3 (трех) дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Дата и время начала и окончания электронных торгов	**Начало торгов: 05.09.2022 в 13.00. Окончание торгов: 05.09.2022 в 14.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов
Дата и время окончания приема заявок	**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 02.09.2022 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» – www.ipmtorgi.by**

Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06, E-mail: auction@cpo.by

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by**
Продавец	**ОАО «Сбер Банк», 220005, г. Минск, бульвар имени Мулявина, 6**
Оператор ЭТП	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46. www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов	Начальная цена с НДС 20 %
Магазин (здание специализированное розничной торговли) общей площадью 1176,8 кв. м, инвентарный номер 500/С-22967, по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 19Б/5. **Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве общего долевого постоянного пользования (доля 131/625) для реконструкции существующих зданий и сооружений под торговые павильоны и строительство новых зданий, сооружений и торговых павильонов рынка по продаже строительных, электротехнических, сантехнических материалов и оборудования общей площадью 7,7627 га	**725 894,35** бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ» г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – **ЗАО «Центр промышленной оценки»**

Срок подписания договора купли-продажи: 10 рабочих дней после электронных торгов

Условия оплаты предмета электронных торгов: не более 30 дней со дня заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение от 0,1 до 3 % от цены продажи лота

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 05.07.2022 г.

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Дата и время начала и окончания электронных торгов	Начало торгов: 10.00 **24.08.2022.** Окончание торгов: 12.00 **24.08.2022.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов
Дата и время окончания приема заявок	Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **22.08.2022** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by
Контактные данные	**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

В извещении РУП «ТД «ВОСТОЧНЫЙ» от **23.07.2022 № 143 (29765)** произошли следующие изменения:
лот № 15 снят с открытого аукциона, назначенного на **25.08.2022**.

УНП 101127633

...ЯГАДКА ЗНОЎ

Ці магчыма ў 45 выглядаць на 25? Шукаем «лекі ад старасці»

«Час не ўладны над ёй», пісаў Шэкспір аб Клеапатры. Цікава, што на момант пачатку знакамітай гісторыі кахання, апісанай у трагедыі «Антоній і Клеапатра», царыцы Егіпта, якая на многія стагоддзі стала сімвалам спакуслівай прыгажосці, было 60 гадоў. Перамагчы старэнне і захаваць маладосць — не толькі вечная і нязбытная мара, але і шлях, па якім чалавецтва ўжо зрабіла мноства крокаў...

Ну, у 60 на 25 — гэта наўрад ці, а вось у 40 на 30 выглядаць магчыма, запэўніваюць касметолагі. Праўда, у такую мэту прыйдзецца сур'ёзна ўкласціся — спатрэбяцца намаганні плюс грашовыя рэсурсы.

— Гэта павінен быць комплекс, праца жанчыны з некалькімі спецыялістамі: дыетолагам, эндакрынолагам, урачом-касметолагам, касметыкам і, хутчэй за ўсё, пластычным хірургам. Калі вы сапраўды хочаце выглядаць на 10-15 гадоў маладзей за свой узрост, калі вы не верыце ў казкі і не з'яўляецеся адной з тысяч, каму пашанцавала з генетыкай, іншага шляху да гэтай мэты пакуль не існуе, — распавядае **касметолаг Ала ТРАФІМОВІЧ.**

Для пачатку, адзначаюць спецыялісты, прыйдзецца ліквідаваць застарэлыя «болькі». У першую чаргу гарманальныя парушэнні, якія ў нашы дні ў 40 гадоў ёсць у абсалютнай большасці жанчын. І гэта не толькі гінекалогія. Часта праблема ў шчытападобнай залозе, надныркавых, іншых органах гарманальнай сістэмы. Калі ліквідаваць «паломкі» немагчыма, стан арганізма варта скарэктаваць да нормы з дапамогай прэпаратаў. І толькі пасля гэтага пачынаць працаваць са знешнімі праявамі старэння. Інакш усе намаганні будуць дарэмныя.

Прыкметы ўзросту — што з імі рабіць?

Што ж выдае наш узрост? Пачнём з таго, як час мяняе твар. Гэта змены вугла ніжняй сківіцы і змяшчэнне тлушчавых пакетаў, пачынаючы з перыарбітальнай і скулавых зон. Адна з узроставых праяў — змена павека (зморшчына верхняга павека з узростам перамяшчаецца бліжэй да пераносся). Скарэктаваць гэтыя змены пры дапамозе «цудадзейных крэмаў» або нават моднага цяпер масажу твару, на жаль, немагчыма. Эфектыўнымі на сённяшні дзень касметолагі называюць два шляхі. Радыкальны — звярнуцца да пластычнага хірурга і зрабіць ліпафілінг, або больш ашчадны — звярнуцца да ўрача-касметолага і зрабіць контурную пластыку. Пачынаць усё ж лепш з контурнай пластыкі, гавораць спецыялісты. Так вы зможаце пераканацца, што вам спадабаецца тое, як зменіцца ваш твар. Таму што змены могуць і не спадабацца. Контурная пластыка накіравана на тое, каб перамясціць тлушчавыя пакеты ў верхнюю частку твару з ніжняй. Працэдура выкарыстоўвае альбо ўласны тлушч з іншых зон, альбо штучныя філеры. Пачынаць касметолагі раяць са штучных філераў, якія можна цалкам выдаліць, калі вынік не выкліча захапленне. Ад уласнага тлушчу пазбавіцца будзе больш складана. Пасля ўколаў філераў нярэдка здараецца, што жанчыны просяць вярнуць «як было да працэдуры»: звыклы «стомлены твар» здаецца ім больш прымальным, чым «мячыкі» на скулах. Праўда, ацэньваць вынік важна толькі пасля поўнага зажыўлення, кажуць спецыялісты — калі ацёк спадае, каля паловы першапачатковага аб'ёму сыходзіць.

Дарэчы, пахудзенне, якое прынята лічыць абсалютнай карысцю для жанчыны ў любым узросце, пасля 40 гадоў здольнае візуальна дадаць некалькі гадоў да ўзросту, кажуць касметолагі. Хочаце выглядаць маладзейшай — захоўвайце стабільную вагу. Справа ў тым, што, зніжаючы вагу ў 30, арганізм захоўвае тлушчавыя пакеты на твары, а строгая дыета і рэзкая страта вагі ў 40-45 здольныя ператварыць ваш твар у «твар муміі».

Можна, вядома, пайсці іншым шляхам. Схуднець і вярнуць аб'ёмы твару з дапамогай ліпафілінгу. І далей ужо падтрымліваць стабільную вагу. Сёння бьюці-індустрыя адмовілася ад спосабу «проста нацягнуць скуру» — гэта дае толькі твар-маску, так званы эфект Гурчанкі. Пераразмеркаваўшы аб'ёмы, можна атрымаць візуальны эфект маладога твару і жаданыя «мінус 10 гадоў».

Наступная «прыкмета старэння» — «рознакаляровы» твар. Узрост выдае пігментацыя ў пэўных зонах — лоб, паласа «шчокі—нос», верхняя губа і падбародак. Гэтыя зоны пакрываюцца плямамі і становяцца цямнейшымі за астатнія. Што, дарэчы, асабліва актуальна менавіта летам. Раўнамерна светлы твар дасць візуальны эфект «некалькі гадоў мінус». Выдаліць пігмент усё ж прасцей і танней, чым пераразмеркаваць аб'ёмы на твары — і гэта добрая навіна. Дапаможа адбельвальны крэм, а ў складаных выпадках — лазерныя або фотаметодыкі. Але і ў такім выпадку эфект прыйдзецца падтрымліваць, выкарыстоўваючы адбельвальныя сыроваткі і крэмы і хаваючы твар ад сонца.

— Каб выглядаць маладзей за свой узрост, патрэбная вельмі разнапланавая работа. Старэе не толькі скура, але таксама косці, мышцы, тлушчавыя структуры. І ўсімі гэтымі пытаннямі займаюцца розныя спецыялісты. Словам, гэта як у «Алісе ў краіне цудаў»: каб заставацца на месцы, даводзіцца бегчы з усяе сілы.

Пагаворым пра бег

Але ці варта «бегчы з усяе сілы»? Бо ў гэтай гонцы ўсё роўна рана ці позна давядзецца прайграць. Дык ці не прасцей прыняць свой узрост? Пра тое, як гэта зрабіць, напісана нямала — і ў сур'ёзнай літаратуры (у тым ліку псіхалагічнай), і ў сацсетках. Аб гэтым цікава сказаў Барыс Акунін: «Старэнне павінна быць выгаднай гандлёвай аперацыяй, натуральным абменам фізічнай сілы на духоўную, вонкавай прыгажосці — на ўнутраную». А вось парада ад Монікі Белучы (якой, дарэчы, 58 гадоў): «Што я буду рабіць, калі пастарэю і мой адбітак у люстэрку больш не будзе радаваць? Я не буду глядзець у люстэрка — я буду глядзець на сваіх дзяцей...»

Зрэшты, правільны хатні догляд ніхто не адмяняў. І, разам з мудрым стаўленнем да свайго ўзросту, ён дапаможа, што называецца, «старэць прыгожа». Такі падыход не дазволіць выглядаць у 45 на 30, але дасць магчымасць дасягнуць таго рэдкага эфекту, калі з узростам жанчына выглядае ўсё больш шляхетна і становіцца толькі прыгажэйшай. Касметолагі кажуць, што чым старэйшай становіцца жанчына, якая даглядае сябе, тым больш прыкметная розніца паміж ёй і яе аднагодкамі, якія не займаюцца такім доглядам. У 60 гадоў візуальная разбежка складае гадоў 15.

— У хатнім доглядзе жанчыны, пачынаючы з 40—45 гадоў, адначасова павінны прысутнічаць кіслоты (АНА, ВНА), рэцінол, пептыды і ахова ад УФ-прамянёў круглы год. У ідэале, можна было б час ад часу дадаваць апаратную касметалогію (лазерныя і фотапрацэдуры). На малады рэльеф твару працуюць фэйсфітнес і масаж твару.

Дарэчы, пра фітнес. Маладосць — гэта не толькі твар, але і падцягнутае цела, не толькі адсутнасць маршчын, але і маладая пластыка рухаў. Без фізічных нагрузак гэтага не дасягнуць. Праўда, сучасная бьюці-індустрыя стварае «сцяжынкі» і для лянівых. Але рознага роду абгортванні, спавіванні і іншыя працэдуры, якія даюць сапраўды бачны эфект, маюць мноства супрацьпаказанняў (у першую чаргу — гіпертанія і кардыялагічныя захворванні). У адрозненне ад таго ж бегу трушком. Які, дарэчы, яшчэ і значна таннейшы.

Увогуле, рэцэпты калі не вечнай, то доўгай маладосці сёння знойдзеныя — праўда ісці па гэтым шляху можа, ды і хоча не кожная. Але пошукі працягваюцца і галоўнае ў іх — не зайсці куды-небудзь не туды. Напрыклад, сёння актыўна развіваецца кірунак так званай прэвентыўнай медыцыны. Прэвентыўная, або антыўзроставая (яна ж антыэйдж-медыцына) — кірунак альтэрнатыўнай, мэтай якога з'яўляецца прафілактыка любога роду расстройстваў і захаванне актыўнага даўгалецця. Асноўны пасыл такі: каб максімальна запаволіць старэнне, неабходны напрамак медыцыны на стыку эндакрыналогіі, гематалогіі, касметалогіі і геранталогіі. Калі медыцына мае справу з хваробамі, а касметалогія — з прыкметамі старэння, то філасофія прэвентыўнай медыцыны — не дапусціць развіцця хвароб і апярэдзіць узроставыя змены. То-бок, у ідэале, гэты кірунак павінен займацца выяўленнем змяненняў у арганізме, здольных прывесці да захворванняў, і прыняццем адрасных мер па іх прадухіленні. Тое ж самае — са старэннем: уздзейнічаць на прычыну тых ці іншых змен, а не маскіраваць іх праявы. Пацыент атрымлівае індывідуальна распрацаваную праграму, якая ўключае вітаміны, мікраэлементы і іншыя рэчывы, неабходныя ў дадзены момант яго арганізму, каб запусціць механізмы амаладжэння. Такім чынам, прэвентыўная медыцына спрабуе кіраваць станам здароўя і рэзервамі арганізма з дапамогай прыняцця адрасных мер для кожнага канкрэтнага пацыента на аснове яго аналізаў. У ідэале, цалкам прайшоўшы гэтую праграму, ён павінен атрымаць не толькі выдатны вонкавы выгляд, але і «маладое» самаадчуванне. Асноўны пастулат — быць маладым і здаровым, а не толькі здавацца.

Але бяда ў тым, што чалавечы арганізм — вельмі складаная сістэма. І праблемамі прэвентыўнай медыцыны сёння называюць, з аднаго боку, вельмі высокі кошт паслуг (яна ўваходзіць у прэміум-сегмент камерцыйнай медыцыны), з другога — менавіта так, адсутнасць эфекту большай часткі прызначэнняў і праграм. Большасць геранталогаў свету лічыць прэвентыўную медыцыну лжэнавукай. Ды і самі спецыялісты прэвентыўнай медыцыны, біягерантолагі, адзначаюць, што методыкі, якія выкарыстоўваюцца, пакуль эксперыментальныя, а ўсе пабочныя эфекты прадказаць немагчыма.

Дзіяна РОНІНА.

БЕЗ СНУ 11 СУТАК. САМНОЛАГ АБ РЭКОРДАХ І ІХ НАСТУПСТВЫ

Без сну чалавек памрэ хутчэй, чым ад адсутнасці вады або ежы, паведаміла ў інтэрв'ю ўрач-самнолаг Яўгенія ЦІМАШЭНКА.

«Людзі часта спрабавалі паставіць рэкорды па часе, праведзеным без сну, было мноства такіх адчайных. Напрыклад, у 1964 годзе 17-гадовы амерыканец Рэндзі Гарднер паставіў сусветны рэкорд па бяссонніцы — гэта 11 сутак і 25 мінут. Былі людзі, якія і больш не спалі, але яго рэкорд быў зафіксаваны, ён праводзіў увесь гэты час з урачом-самнолагам у закрытым памяшканні, і ўсё фіксавалася дакументальна. На чацвёртыя суткі бяссонніцы ў хлопца пачалася збылтанасць свядомасці. На шостыя — ён ужо ўяўляў, што ўдзельнічае ў міжнародных спаборніцтвах па рэгбі, гэта значыць пачаліся галюцынацыі. На дзявятыя суткі, калі хлопцу прапанавалі простае заданне — ад 100 адняць 7, ён спыніўся на 65. Яго спыталі, што далей, а ён сказаў, што не памятае заданне. На 11-я суткі ў яго назіраліся моманты страты памяці, галюцынагенныя і шызафрэнічныя эпізоды. Праз 11 сутак ён заснуў. Так, ён потым даваў інтэрв'ю, што адчуваў сябе добра, але медыцынскімі работнікамі было зафіксавана іншае.

Людзі часта задаюць пытанне, што больш неабходна чалавеку — сон, вада або ежа. Без сну чалавек памрэ хутчэй, чым ад абязводжвання і адсутнасці ежы», — расказала карэспандэнту Яўгенія Цімашэнка.

Самнолаг адзначыла, што фізіялагічна чалавеку для сну неабходна не менш за восем гадзін. «Ёсць, вядома, індывідуальныя выпадкі, калі чалавек можа спаць чатыры гадзіны, і яму будзе гэтага дастаткова. Але такіх вельмі малы працэнт. Некаторыя людзі спяць, наадварот, больш за восем гадзін у дзень, ім не хапае гэтага часу. Хоць, як правіла, у 99 працэнтаў людзей неабходнасць у сне складае восем гадзін, гэта фізіялогія. У працэсе сну чалавек праходзіць пяць паўнацэнных цыклаў, адзін з якіх доўжыцца ў сярэднім 100 хвілін, гэта значыць восем гадзін сну — фізіялагічная норма», — дадала яна.

Пісьменніцкія вандроўкі

ГНЯЗДЗІЛАВА: ЦЕНЬ ПАЛАЦА, ЦЕНЬ ПУШКІНА

ПА Мядзельшчыне можна падарожнічаць бясконца... Колькі там паміж азёраў і лясоў жывапісных старажытных мястэчак і вёсак з незвычайнымі гісторыямі, колькі храмаў і сядзіб, капліц і млыноў, броваў і корчмаў рознай ступені захаванасці... Тое наша падарожжа пачалося з руін вадзянога млына на рэчцы Вузлянка. Пабудаваны млын яшчэ ў XVII стагоддзі, ёсць драўляны масток, з якога адкрываюцца незвычайныя краявіды з вадаспадамі... Цяпер тут аграсядзіба, дзе прымаюць турыстаў: можна і на байдарках праплысці, бабрыныя хаткі паглядзець...

Потым каля шашы Мядзел — Докшыцы мы раскаліся на ўзгорак у полі, на якім захаваліся рэшткі капліцы XVII стагоддзя з маёнтка Снарскіх Старая Жорсна. Уласна кажучы, гэта амаль усё, што засталося ад маёнтка — а менавіта капліца, у якой служылі бернардзінцы, была ўзарваная ў 1950-х... Абгрызены часам і варварскімі адносінамі нашчадкаў мур атачаюць бярозкі...

У Будславе, палюбаваўшыся на знакаміты касцёл, доўга хадзілі вакол рэшткаў сядзібы Аскеркаў, параўноўваючы рэальнасць са старымі фотаздымкамі... Цяжка ўявіць, што каржакаватае збудаванне з аблезлымі калонамі, пафарбаванае ў блякла-блакітны колер і ператворанае ў дрывотню — гэта урачысты ўваход у калісьці дыхтоўны палац... У афіцыне ж палаца, зведзенай да цаглянага пастакутніка, сёння знаходзіцца мясцовая амбулаторыя. Пабывалі ў зруйнаванай Траецкай царкве каля вёскі Маставікі, у сядзібна-палацавым комплексе Дамейкаў Сітцы, дзе ўразілі чатыры высокія калоны, на якія абапіраецца толькі неба — усё, што засталося ад згарэлага палаца...

ЗА ГАТЫЧНЫМІ БРАМАМІ

А вось дзве велічныя пабеленыя брамы, што нагадваюць сярэднявечны замак: тоўсты мур, зубцы наверсе, аркі і круглыя нішы... Брамы вось ужо колькі часу аддана вартуюць уваход у сядзібу Слатвінскіх Гняздзілава. У іх угадваюцца нібыта два здзіўленыя твары з выратаванымі вачыма і адкрытымі ратамі... А што ж гэта вы нарабілі, нашчадкі?

Першыя пісьмовыя згадкі пра Гняздзілава, якое называлася ад пачатку Гнездзіловічы, сягаюць ажно ў 1407 год. Тады князь Вітаўт падарыў двор Гнездзіловічы Войцаху Манівіду, першаму віленскаму ваяводу. У Манівіда было дзве дачкі... Вось з-за іх вёска і раздваілася — бо паненкі падзялілі гэтую частку спадчыны між сабою. Так і ўзніклі Паўднёвае Гняздзілава і Паўночнае, нават пасля трапілі ў розныя губерні: Паўднёвае — у Віленскую, Паўночнае — у Мінскую.

Мы апынуліся ў Паўднёвым, тым, што з пасагам дачкі Войцаха Манівіда Соф'і перайшла да Мікалая Радзівіла, таксама ваяводы віленскага. У радзівілаўскіх уладаннях Гнядзілава знаходзілася да XVII ст., пасля пайшлі чаргавацца ўладары: Гутаровічы, Шышкі, Козел-Паклеўскія. Належала Гняздзілава Рудамінам-Дусяцкім, якія падаравалі Вольбаравічы і Гняздзілава кляштару босых кармелітаў у Глыбокім. А ў канцы XIX стагоддзя дачка ўладальніка Вільгельміна Козел-Паклеўская пабралася шлюбам з Ёзафам Слатвінскім. Вось Слатвінскі і збудаваў тут сядзібу, дакладны выгляд якой мы можам толькі ўяўляць па старых дакументах ды фота. Вядома, што была сядзіба ў стылі класіцызму, мелася мураваная тэраса. Вакол палаца рос самшыт. У самім палацы былі белыя кафельныя печы, сталовая, абшытая дубам, партрэтная галерэя...

На месцы тога будынка пасля зладзілі сушыльны ток. Не ведаю, ці той самы, але знайшлі мы нейкі падобны будынак, вялізны, пусты, з цэментнай падлогай і драўлянымі апорамі ўнутры... Праз прарэхі ў даху заглядае непрыветнае неба.

Захавалася і троху гаспадарчых збудаванняў сядзібы... Лядоўня — таямнічыя сутарэнні, у якіх турысты спадзяюцца ці скарбы знайсці, ці прывідаў пабачыць... Ну, паводле логікі, хіба прывідаў колішніх пальцам піханых каўбасак ці квашаніны, што тут захоўваліся.

ПОМНІК ЛЯ СТАРОЙ КАПЛІЦЫ

Сярод старых дрэў, якія засталіся ад колішняга парку, мы блукалі адны. Каля невялічкага драўлянага збудавання, аднак, віраванне жыццё. Стаяць нечыя машыны, з-за зачыненых дзвярэй чуюцца ўрачыстыя галасы... Капліца Шышкаў і Козел-Паклеўскіх. Купал з ліхтарыкам нагадвае купал Мядзельскага касцёла. Падмурак капліцы каменны... Там крыпта з пахаваннямі. Будавана гэта ў 1782 годзе. Капліца нядаўна адноўленая, асвечаная ў гонар Ісуса Міласэрнага.

Паколькі ў капліцы ідзе служба, унутр не заходзім — разглядаем помнікі, што захаваліся побач. Адзін з помнікаў, з высечанымі ў чорным камені лацінскімі літарамі, прыцягвае ўвагу: Аляксандра Дубельт з Замайскіх, генеральша. Памерла 18 сакавіка 1867 года. Памятнік устанавілі зяць і ўнучкі.

Знаёмае прозвішча змушае задумацца... У гісторыі застаўся Лявонцій Дубельт, начальнік III аддзялення, кіраўнік імперскай тайнай паліцыі і штаба жандармскага корпуса, верны слуга Мікалая I, чалавек разумны і не бяздарны, які, аднак, трэціраваў Пушкіна, Гогаля, Някрасава, Тургенева, Салтыкова-Шчадрына, саслаў на Каўказ Лермантава, займаўся жорсткай літаратурнай цэнзурай... Ці не мае адносін да яго гэтая Аляксандра з Замайскіх, пахаваная каля маленькай капліначкі ў закінутай беларускай сядзібе?

Як выявілася — мае, і непасрэднае! У Лявонція Дубельта быў малодшы брат, Пётр Васілевіч Дубельт, які нарадзіўся ў 1794 годзе ў Магілёве. Калісьці яны разам скаралі Пецярбург, разам рабілі вайсковую кар'еру... Паходжанне, дарэчы, прыпісвалі сабе фантастычнае — нібыта іх маці, Марыя, была выкрадзенай іспанскай прынцэсай, спакушанай зухаватым гусарам Васілём Дубельтам... Па сведчаннях сучаснікаў, браты яшчэ падлеткамі былі добра выхаваныя, ведалі некалькі моў... Дык вось, Пётр Дубельт ажаніўся з Аляксандрай з Замайскіх, так што гэта нявестка начальніка III аддзялення пахаваная ў Гняздзілаве!

ДУБЕЛЬТЫ, ЗАМАЙСКІЯ, ПУШКІНЫ

Звестак пра Замайскіх я знайшла няшмат... Сярод іншага, у спісе «Дворян Минской Губернии, давшим полномочие на подписание Всеподданейшего письма на имя Государя Императора» ад 12 лістапада 1863 года значыцца памешчык Мазырскага павета Фадзей Замайскі і памешчыкі Мінскай губерні Аляксандр і Казімір Замайскія. Сярод студэнтаў фізічнага факультэта Віленскага ўніверсітэта ў 1820-м ёсць Генрык Замайскі. Магчыма, сваякі Аляксандры Канстанцінаўны?

Замайскія карысталіся гербам «Кердэй», з трыма лілеямі на сіняй палове шчыта. Сустрэла некалькі дакументаў, у якіх Замайскія атаясамляюцца з Замойскімі, але гэта ўсё-ткі розныя роды — польскія Замойскія былі графамі.

Пётр Дубельт падчас вайны з Напалеонам і потым, падчас вайсковай службы. Калі паненка Замайская пашлюбавалася з ім? У 1823-м у пары нарадзіўся сын Канстанцін, Пятру Дубельту было дваццаць дзевяць. Зрабіў някепскую кар'еру — на службу вайсковую паступіў 24 чэрвеня 1810 года, з шаснаццаці гадоў, у 1846—1849 гадах ужо быў камандзірам 1-га лёгкага кавалерыйскага корпуса, які дзейнічаў у Ліфляндыі і Курляндыі...

Пра нявестку, Аляксандру Канстанцінаўну з Замайскіх, неаднаразова згадваецца ў лістах жонкі Лявонція Дубельта Ганны. Нядзіўна — з 1840-х Аляксандра жыла ў доме Лявонція Дубельта ў Санкт-Пецярбургу. А значыць, сустракалася і з жонкай яго сына Міхаіла... Якой была Наталля, дачка Аляксандра Пушкіна. Таго самага паэта, чые вершы пасля ягонай смерці начальнік Трэцяга аддзялення забараніў друкаваць...



Гісторыя была дзіўная... Наталля Пушкіна, вясёлая шаснаццацігадовая прыгажуня, прыняла заляцанні Міхаіла Дубельта пасля таго, як Мікалай Арлоў, які ёй сапраўды падабаўся, не змог зрабіць ёй прапанову з-за волі свайго бацькі...

Сваякі Ташы былі супраць яе шлюбу з гулякам Дубельтам — але яна настаяла на сваім, і ў 1853-м стала пані Дубельт... Пра што пасля вельмі пашкадавала. Пляменнік мужа Аляксандры з Замайскіх быў нораву шалёнага, гулец, п'янтос, да таго ж распускаў рукі... Дачка Пушкіна хадзіла ў сіняках. З вялікай цяжкасцю дамаглася разводу...

Цікава, на чыім баку была Аляксандра з Замайскіх? Наўрад ці ішла супраць магутнай сям'і, дзе любілі вясёлага Мішу.

«ДА И ДОРОГОЙ ОНА ТЕБЯ ПОБЕРЕЖЕТ»

Ганна Мікалаеўна Дубельт 15 ліпеня 1835 года піша мужу: *«Как жаль, если Машинька Дубельт не выдержит этой болезни, жаль не для нее, а для бедных родителей. Миленькая девочка, какое бы она была для них утешение»*. Гаворка пра дачку Пятра і Аляксандры Дубельт Марыю. Яна нарадзілася ў 1825-м, а памерла ў 1835-м. Падобна, тая хвароба, пра якую згадваецца ў лісце, была фатальнай.

А 6 кастрычніка 1849 года Ганна Дубельт піша: *«Если же ты решишь приехать теперь, то привези с собою сестру Александру Константиновну, если можно оставить хозяйство без нее в Петербурге... Если ты привезешь Александру Константиновну, а она решится расстаться с Соничкой на несколько дней, то я этому очень буду рада; и здесь тебе будет с нею веселее, да и дорогой она тебя побережет»*.

Тут гаворка пра другую дачку Аляксандры з Замайскіх, Соф'ю, якая нарадзілася ў 1834-м.

Значыць, менавіта муж Соф'і Дубельт і ставіў помнік у Гняздзілаве... Шкада, але пакуль я не знайшла, кім той зяць Аляксандры быў, магчыма, гэта б растлумачыла, чаму генеральша пахаваная ў Гняздзілаве.

ПЕРЫПЕТЫІ РАДАВОДАЎ

Але знайшліся звесткі пра сына Пятра і Аляксандры Дубельтаў, Паўла Пятровіча, генерал-лейтэнанта, не надта адукаванага, але баявітага вайскоўца. У 1863 годзе ён уціхамірваў паўстанне Каліноўскага... Пра яго і адзываюцца як пра вернападданіцкага служаку.

Між тым надпіс на помніку Аляксандры з Замайскіх зроблены на польскай мове і знаходзіцца каля каталіцкай капліцы. Пані Дубельт відавочна захавала веру бацькоў.

Цяжка разабрацца ў старых радаводах за кароткі час... Вось, напрыклад, выданне «1854. Путеводитель. 60 000 адресов из СПб, Царского Села, Петергофа, Гатчина и прочия», там гаворыцца: «Дубельт Павел Петровичъ, гвардии прапорщик, проживает в С.-Петербурге, ул. Захарьевская, дом № 12 (Литейная часть 4-й квартал). Этот дом принадлежит его дяде, Дубельту Леонтию Васильевичу, где проживает он сам с женой Александрой Константиновной и с сыном Михаилом Леонтьевичем Дубельтом. Здесь же проживает родной брат Павла Петровича Дубельта, Константин Петровичъ».

Тут відавочная памылка, бо Аляксандра Канстанцінаўна — не жонка, а нявестка Лявонція Дубельта.

Колькі ценяў мінулага вакол сціплай драўлянай капліцы... Нават Аляксандр Пушкін згадаўся. А колькі яшчэ гістарычных таямніц захоўвае Гняздзілава! Напрыклад, апошні ўладальнік сядзібы, Людвіг Слатвінскі, дапамагаў мясцоваму таленавітаму хлопцу Сяргею Вішнеўскаму. Дзякуючы яму Сяргей паступіў у Віленскую мастацкую вучэльню імя Адама Міцкевіча, стаў мастаком, займаўся фатаграфіяй. Шмат маляваў і Гняздзілава.

Калі будзеце ў тых мясцінах — не праміне, наведайце старую сядзібу... Можа быць, увага людзей да гэтага месца нешта зменіць у яе лёсе.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

Прайсці пакручастымі шляхамі паэта

Адкрылася выстава да юбілею Пімена Панчанкі

«У мястэчку Бягомль, у дрымучых лясах вярхоўя Бярэзіны, прайшло маё дзяцінства... Духмяная звонкая зямля, родны дом, напоўнены казкамі, паданнямі, легендамі. З малых гадоў усе мы вучыліся пасвіць у лесе кароў, збіраць ягады і грыбы, вязаць венікі, выразаць з балотнай бярозы чачоткавыя кіі, а з лазы — дудкі і свісткі, знаходзіць птушыныя гнёзды, запасаць на зіму арэхі і рабіну...»

Так натхнёна пісаў пра сваё дзяцінства народны паэт Беларусі Пімен Панчанка. У гэты год, багаты на літаратурныя юбілеі, мы адзначым і яго 105-годдзе. Дата выпадае на 23 жніўня, але ўжо ціпер у Мінскай гарадской бібліятэцы № 14 імя Францішка Багушэвіча адбылося адкрыццё выставы, якая распавядае пра жыццёвыя шляхі паэта, прадстаўляе рэдкія дакументы. Выстава была арганізавана Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры. А незвычайных фактаў у біяграфіі паэта шмат... Нарадзіўся ён не каля любай сэрцу Бярэзіны, адкуль усе продкі, а ў Рэвелі, цяперашнім Таліне. Сям'я будучага паэта паехала туды ў заробкі, бацька працаваў рабочым на будоўлі караблёў.

Ні шторму, ні буры тады не было,
Калі нарадзіўся я ў Таліне.
Звычайнае сонца звычайна ўзышло
Пасля гадзіны світальнай.

У 1921 годзе сям'ю, акрамя бацькі, пераправілі праз польска-савецкую граніцу ў СССР. Вось так і пачаўся беларускі перыяд біяграфіі... У Бягомлі паэт скончыў школу-сямігодку, пачаў складаць вершы... Жыццё не песціла, давялося зусім юным працаваць у Бабруйску на дрэваапрацоўчым камбінаце... Потым былі настаўніцкія курсы і інстытут, а ў 1938-м выйшаў першы зборнік з красамоўнай назвай — «Упэўненасць». Як гэты зборнік выглядаў, можна ўбачыць у экспазіцыі выставы. Але не толькі тым, што ён першы для аўтара, гэты зборнік ціпер адметны... У юбілейны год Пімена Панчанкі гадзіннікавы завод «Луч» у межах калекцыі «Мова» выпусціў серыю гадзіннікаў, прысвечаных Панчанку — за аснову дызайну ўзяты менавіта зборнік «Упэўненасць».

Асобны стэнд — «Дарога вайны» — распавядае пра ваенныя старонкі жыцця... Пімен Панчанка быў прызваны ў Чырвоную Армію ў верасні 1939 года. Ён не здагадваўся, што вайсковая служба зацягнецца да 1946-га. Удзельнічаў у вызваленні Заходняй Беларусі, у час Вялікай Айчыннай працаваў у розных вайсковых выданнях, быў узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі» і «Партызану Айчыннай вайны» 1-й ступені. Яго шматлікія шчымлівыя, уражальныя вершы пра вайну — ад уласнага досведу. Вось на фотаздымку, зробленым у ліпені 1943-га, ён і Аркадзь Куляшоў у вайсковай форме, маладыя, сур'ёзныя... У тым жа 1943-м Панчанка піша свой шэдэўр «Герой»:

Злосна сказаў: «Уставай, пяхота!
Мы не на пляжы, а на вайне».
І лёг на змяіныя скруткі дроту.
І дзвесце салдацкіх запыленых ботаў
Прайшлі па яго спіне.

А далей — малавядомая старонка біяграфіі... У 1944 годзе Пімен Панчанка ў складзе 34-й арміі трапляе ў Іран. Менавіта там ён напісаў свой паэтычны цыкл «Іранскі дзённік». На стэндах прадстаўлены фотаздымкі паэта таго часу, на фоне экзатычных пейзажаў, і цытуецца верш:

Я ўсё пераблытаў — дзе мора, дзе неба,
Дзе хмары, дзе горы...
Іран.
Красавік.
Даўно я не еў беларускага хлеба,
Ад паху смалістага бору адвык.

У 1946-м паэт нарэшце вяртаецца ў Мінск, і адгэтуль яго жыццё непарыўна звязанае з літаратурай. У падрыхтоўцы экспазіцыі ў бібліятэцы імя Ф. Багушэвіча ўзяло ўдзел выдавецтва «Мастацкая літаратура» — яно прадставіла выданні Пімена Панчанкі, якія менавіта ў ім убачылі свет. А гэта дзясяткі вядомых кніг: «Снежань» (1972), «Млечны Шлях» (1980), «Маўклівая малітва» (1981), «Дзе начуе жаўранак» (1983), «Сіні ранак» (1984), «Лясныя вобласкі» (1985), «І вера, і вернасць, і вечнасць» (1986), «Горкі жолуд» (1988), «Неспакой» (1988), «Высокі бераг» (1993), «Зямля ў мяне адна» (1996) і іншыя. Адзін з адметных зборнікаў з'явіўся пасля смерці аўтара — «Сэрца маё», са знакамітай серыі «Мастацкай літаратуры» «Сто вершаў». Творы Панчанкі суправаджаюцца там рэпрадукцыямі карцін народнага мастака Беларусі Гаўрылы Вашчанкі. Складальнікі палічылі, што спадчына абодвух народных творцаў перагукваецца, мае шмат агульнага.

Намеснік дырэктара выдавецтва «Мастацкая літаратура» — галоўны рэдактар часопіса «Полымя» Віктар Шніп распавёў пра свае сустрэчы з Піменам Панчанкам. Класік падтрымліваў маладых, не шкадаваў добрых парад... Сапраўды, ставіўся па-бацькоўску. Пра што сведчыць вось такая гісторыя, расказаная Віктарам Анатолевічам:

— Мне тады было 19 гадоў. У часопісе «Маладосць» Мікола Аўрамчык выбраў для друку чатыры мае вершы. І вось я прыйшоў у рэдакцыю, каб сфатаграфавацца. У кабінеце Міколы Якаўлевіча быў Пімен Панчанка. І пакуль фатограф Валянцін Ждановіч рыхтаваў да работы свой фотаапарат, Мікола Аўрамчык і Пімен Панчанка рыхтавалі маю прычоску да фотасесіі. Валасы ў мяне былі доўгія і непаслухмяныя. Мікола Якаўлевіч, прычэсваючы мяне, згадаў, што калі ён быў малады, то са сваімі сябрамі, калі ішлі фатаграфавацца, намазвалі валасы алеем, каб яны добра ляжалі. Алею ў кабінеце Аўрамчыка не было, дык галаву мне Панчанка намачыў вадой з графіна. Потым мяне з прычоскай, зробленай Аўрамчыкам і Панчанкам, сфатаграфаваў Ждановіч, і ў 9-м нумары «Маладосці» за 1979 год з'явіліся мае вершы з фотаздымкам...

Падчас адкрыцця выставы сваімі ўражаннямі ад асобы і творчасці Пімена Панчанкі падзяліліся паэты Навум Гальпяровіч і Кацярына Мяшкова. На думку Навума Гальпяровіча, Пімен Панчанка — менавіта з тых паэтаў, якім удалося расчуць «шэпт нябёсаў». А загадчыца бібліятэкі Наталля Стрыгельская заклікала чытачоў не толькі знаёміцца з экспазіцыяй, але і браць для прачытання кнігі юбіляра. Тым больш у Год гістарычнай памяці вельмі карысна пазнаёміцца з ягонымі вершамі на ваенную тэму, бо яны напісаныя сведкам, напісаныя таленавіта і шчыра.

У экспазіцыі прадстаўлена шмат рэдкіх фота... На іх можна ўбачыць паэта з сябрамі і блізкімі. Вось Пімен Панчанка зняты з Іванам Мележам, з Янкам Брылём, з Максімам Танкам, з Васілём Быкавым, з Аркадзем Куляшовым... На многіх фотаздымках ён смяецца ці хоць бы ўсміхаецца. Пімен Панчанка быў чалавекам вясёлым, сардэчным і сціплым, нездарма сваё жыццёвае крэда сфармуляваў так:

...А калі вас уздыме слава,
Аб гэтым думайце радзей...
Глядзіце зверху ўніз на травы
Ці на ваду.
Не на людзей.

Уваход на выставу вольны, таму для ўсіх жадаючых гэта добрая нагода дакрануцца да гісторыі беларускай літаратуры і добрай паэзіі.

Людміла ІВАНОВА.

Духоўнае

Таямніцы зямлі дрыгавічоў

Колькі гадоў Тураўскай епархіі?

Увесь гэты год юбілейны для праваслаўя на беларускіх землях — 1030 гадоў. За зыходную дату бяруць 992 год, калі была заснаваная Полацкая епархія, якая стала першай кафедрай на нашай зямлі. Гэтая дата дакладна вядомая гісторыкам. Але ж на той час было не толькі Полацкае княства, якое ўслед за Кіевам прыняло хрысціянства ўсходняга ўзору. Значна бліжэй да Кіева геаграфічна знаходзілася Тураўскае княства, але афіцыйна лічыцца, што Тураўская епархія пачынае свой адлік з 1005 года. І напэўна, тут яшчэ маглі б быць удакладненні...

Пра веру Хрыстову нашы продкі, хутчэй за ўсё, ведалі раней, чым сюды прыйшлі праваслаўныя святары. Крывічы, радзімічы, дрыгавічы кантактавалі з гандлярамі, якія выкарыстоўвалі знакаміты шлях з варагаў у грэкі, перамяшчаючыся па рэках Заходняй Дзвіны, і Дняпры. Сярод тых людзей сустракаліся хрысціяне. Але так сталася, што сярод полацкіх крывічоў адной з першых прыняла веру Хрыстову і пастыргласа ў манашкі былая жонка вялікага князя Кіеўскага Уладзіміра Рагнеда. Яе старэйшы сын Ізяслаў, паводле Ніканаўскага летапісу, адрозніваўся асаблівай набожнасцю. Паводле летапісных крыніц, Уладзімір падзяліў рускую зямлю на некалькі княстваў, свайго сына Ізяслава пасадзіў у Полацку, а Святаполка — у Тураве. Напэўна ж, працэс прыняцця і ўмацавання хрысціянства ішоў адначасова ў абодвух княствах?

Першыя епіскапы на беларускія землі накіроўваліся мітрапалітамі кіеўскімі, якія былі ў кананічным падпарадкаванні ў патрыярхаў Канстанцінопальскіх. Праз праваслаўную царкву ажыццяўлялася духоўная і культурная сувязь з цэнтрам хрысціянскай цывілізацыі таго часу, што паспрыяла духоўнаму і культурнаму ўздыму, якім былі адзначаныя XI і XII стагоддзі нашай гісторыі. І калі Полацк быў буйным горадам крывічоў, то Тураў аб'ядноўваў вакол сябе дрыгавічоў.

— Новая вера і новая культура не патрабавалі радыкальнага разбурэння традыцыйнага ладу жыцця, але задавалі ідэалы, якіх шукала сама народная душа. Можна сказаць, што нацыянальны генатып выбраў роднасны сабе рэлігійны і культурны архетып. Племянная свядомасць паступова адыходзіла, з'явілася адзіная этнічная самасвядомасць, — адзначае **Валянціна Цяплова, прафесар Мінскай духоўнай акадэміі.** — У Полацку невядомыя такія падзеі, як скіданне паганскіх багоў альбо хрышчэнне агнём і мячом (гэта на першым этапе было, таму што новае яшчэ не праверана жыццём), што суправаджала прыняцце хрысціянства ў Кіеве і Ноўгарадзе. Магчыма, гэта тлумачыцца тым, што палітыка полацкага князя Ізяслава, з імем якога звязана распаўсюджванне хрысціянства на беларускіх землях, адрознівалася для таго жорсткага часу незвычайнай мяккасцю і цярпімасцю. Напэўна, падобным чынам дзейнічала духавенства, якое прыбыло разам з ім, і епіскап, імя якога крыніцы не захавалі. Але трэба адзначыць, што крыніцы па гісторыі распаўсюджвання хрысціянства на беларускіх землях захаваліся ў вельмі абмежаванай колькасці. Таму вялікае значэнне пры вывучэнні гэтай эпохі набываюць матэрыялы археалагічных раскопаў. Калі мы кажам упэўнена і дакладна пра стварэнне Полацкай кафедры, то гісторыя стварэння Тураўскай кафедры — другой праваслаўнай на тэрыторыі беларускіх земляў — не вельмі зразумелая. Адзіным сведчаннем, якое дазваляе характарызаваць і казаць пра прыняцце хрысціянства на тэрыторыі Тураўскай зямлі, з'яўляецца Кіеўскі пацерык архімандрыта Кіева-Пячэрскай лаўры Іосіфа Трызны. Але гэтая крыніца належыць да XVII стагоддзя, яна дастаткова позняя. Менавіта ў ёй згадваецца дата стварэння Тураўскай епархіі — 1005 год. Шэраг даследчыкаў, якія займаліся гісторыяй Тураўскай епархіі, нязгодны з гэтай датай. Напрыклад, беларускі археолаг, прафесар Пётр Лысенка дапускаў, што такая дата, хутчэй за ўсё, не адпавядае рэальнасці. Ён лічыў, што не магло быць, каб такое важнае княства, якім у той час было Тураўскае, прыняло хрышчэнне пазней, чым Полацкая зямля ці іншыя землі тагачаснай Русі. На яго думку датай заснавання Тураўскай епархіі трэба лічыць той жа 992 год. З гэтым меркаваннем пагаджаюцца шматлікія расійскія даследчыкі. Напрыклад, гісторык XIX — пачатку XX стагоддзя Яўген Галубінскі, які вельмі пільна вывучаў эпоху X — XI стагоддзяў у развіцці царквы. Ён таксама называў дату заснавання епархіі ў Тураве тую ж, што і Полацкай.

У гэтым ёсць логіка. Першыя летапісныя згадкі пра Тураў належаць да 980 года. Шмат якія даследчыкі лічаць, што Тураў быў другім па значэнні горадам Кіеўскай Русі. Тураўскае княства ўключала ў сябе такія гарады, як Пінск, Слуцк, Нясвіж. Тэрыторыя Тураўскай епархіі ў першыя стагоддзі яе існавання была шырокая і ахоплівала землі, якія належаць ціпер да Мінскай, Гомельскай, Гродзенскай і Брэсцкай абласцей. А ў самім горадзе пры археалагічных раскопках у 1960-х гадах былі выяўлены руіны старажытнага храма XII стагоддзя, які быў самым вялікім на тэрыторыі княства ў той час, але праіснаваў нядоўга, быў разбураны — і гэта яшчэ адна загадка Тураўскай зямлі. Дарэчы, таксама пры раскопках знайшлі часткова ацалелае Тураўскае Евангелле XI стагоддзя, напісанае кірыліцай. Знойдзены ў 1865 годзе рукапіс — найбольш старажытны з тых, што выяўлены ў Беларусі.

Тураўская епархія перажывала розныя часы, як і сама Беларусь. Але была адноўлена ў канцы XX стагоддзя.

Ларыса ЦІМОШЫК.

ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

«ПРЫЗОЎ – ТОНА!»

Настоящие правила проведения рекламной игры «Прызоў – тона!» (далее – Правила) разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003. № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения рекламной игры «Прызоў – тона!» (далее – Рекламная игра), проводимой в целях стимулирования реализации топлива (АИ-92, АИ-95, ДТ-Евро, СУГ), сопутствующих товаров (кроме табачных изделий, алкогольных и слабоалкогольных напитков, пива) среди прошедших регистрацию обладателей карты-брелока программы благодарности «Дзякуй» ОДО «АСТОТРЕЙДИНГ».

1. Организатор Рекламной игры

